№ 14 (372) 9 красавіка 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

СУЧАСНЫ РАМОНТ

Надышоў час зрабіць рамонт?
Вы не памыліліся!
Тэлефануйце да нас!
Адчуйце сябе эўрапейцам!
8-029-707-35-08

## «Не загасіць вам праўды яснай...»

### Велікоднае пасланьне айца Аляксандра Надсана

Нядаўна мне давялося пачуць па радыё, што ў Беларусі ўлады адмовіліся занесьці ў афіцыйны рэгістар фільм пра Васіля Быкава. Я ня бачыў гэтага фільму і таму не магу рабіць вывад пра яго мастацкую вартасьць. Не разумею таксама, што гэта за рэгістар. Дый наагул, здавалася б, ня варта надаваць гэтай справе вялікага значэньня. Тым ня менш, недзе ў глыбіні душы не дае мне спакою думка, што некаторыя з «моцных гэтага сьвету» хацелі б, каб беларусы забыліся на гэтага вялікага пісьменьніка і чалавека, які праз усё жыцьцё, нягледзячы ні на якія абставіны, заставаўся самім сабою і не ішоў на кампраміс са сваім сумленьнем. Такія людзі звычайна невыгодныя ўладам, якія стараюцца «пахаваць» памяць пра іх. Гісторыя дае нам шмат прыкладаў.

Міжволі прыходзіць на думку тое, што здарылася амаль дзьве тысячы гадоў таму назад, калі тыя, якія ўважалі сябе духоўнымі правадырамі народу, дамагліся сьмерці невыгоднага ім Чалавека, які гаварыў словы, прыкрыя для іх, але якога народ слухаў з захапленьнем.

Працяг на старонцы 10.


PHOTO.BYMEDIA.NET

## Віктара Шэймана са справаздачай

Кожны раз, калі дыктар «Панарамы» паведамляе: «Сёньня прэзыдэнт рэспублікі Аляксандар Лукашэнка прыняў з справаздачай генэральнага пракурора Віктара Шэймана», — тысячы людзей заміраюць каля тэлевізараў. У аўторак ён прыняў яго чарговы раз. Старонка 3.

## Новікава дырэктарам, Новікаву пад суд

Дысыдэнтцы Аксане Новікавай пагражае арышт. А камуніст Васіль Новікаў стаў дырэктарам Інстытуту філязофіі. Старонка 3.



## ля і неба дной лізе

15 красавіка стартуе 14-ы нацыянальны футбольны чэмпіянат. Грашовыя сакрэты беларускага футболу. Старонка 11.

# Хрыстос ня два разы ўваскрос


ВЫЦІНАНКА ТАЦЯНЫ МАРКАВЕЦ

Тэма нумару. Старонкі 6—10.

## Электронны перакладчык



Праграміст Хведар Піскуноў распрацаваў кампутарную праграму «Расейска-беларускі й беларуска-расейскі перакладчык». Яна працуе пад абодва нарматыўныя стандарты — наркамаўку й тарашкевіцу. Старонка 12.

## Не багі мову твораць

У беларускамоўных газэтах рэдка пабачыш сканворды. «НН» друкуе сканворд упершыню (**старонка 16**). Гэта не зусім крыжаванка. Само слова «сканворд» утварылася ад «скандынаўскі» — скандынаўская загадка. Дарэчы, слова «крыжаванка» мае канкрэтнага аўтара. Яго прыдумаў як адпаведнік для ангельскага «красворд» у 1989 г. Ян Максімюк, для патрэбаў беластоцкае газэты «Ніва». За 15 гадоў гэтае трапнае слова яшчэ як прыжылося і нават трапіла ў слоўнікі.

Запрашаем чытачоў ня толькі пабавіцца нашым сканвордам, але і прапанаваць для гэтага слова прыгожы беларускі адпаведнік.

## Зь Беларусі – у Эўропу

Абвяшчаецца конкурсны набор на ліцэйскія курсы для вучняў 8—11 клясаў сярэдніх школаў Менску й Менскага раёну. На курсах вывучаюцца дысцыпліны базавай і сярэдняй школы на ўзроўні, дастатковым для здачы экстэрнам экзаменаў на атрыманьне пасьведчаньня аб базавай і атэстату аб сярэдняй адукацыі. Паглыблена, у індывідуальным парадку, вывучаюцца дысцыпліны гуманітарнага цыклу: беларуская і замежныя мовы, літаратура, гісторыя, геаграфія.

Навучаньне вядзецца выкладчыкамі колішняга Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа паводле праграмаў, распрацаваных у Ліцэі.

Распрацоўваюцца пляны стварэньня прыватнага Беларускага гуманітарнага ліцэю, у якім змогуць займацца навучэнцы ліцэйскіх курсаў, а таксама арганізацыі навучальнага працэсу за мяжой. Выпускнікі Ліцэю будуць мець магчымасьць атрыманьня бясплатных стыпэндыяў на навучаньне ва ўнівэрсытэтах эўрапейскіх краінаў.

Больш падрабязную інфармацыю пра ўмовы конкурсу можна атрымаць праз тэлефоны: 8-0296-29-59-03; 8-0296-39-27-15; 8-0296-33-48-59.

Курсы ладзіць індывідуальная прадпрымальніца Савіцкая У., пасьв. №690215877, выд. Менскім аблвыканкамам 4.01.2003.

**«Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага і міжнароднага жыцьця.**
«Наша Ніва» — гэта 16 старонак без чужога слова штотыдзень. Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку» ды ў прыватным агенцтве «Эй Бі ПрэсСэрвіс». Цана на месяц — 2580 рублёў на поштах або 1800 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». Гэта абыдзецца нашмат таньней, чым купляць уразроб.
**Дык падпісвайся!**

## Халопік прарасейскі

Пункт аб прыярытэтным партнэрстве з Расеяй мусіць вярнуцца ва ўрадавы дакумэнт! — патрабуе лідэр дэпутацкай групы «Спрыяньне эканамічнаму разьвіцьцю». **Старонка 3.**

## Гіт-парад першакрасавіцкіх жартаў

Генэрал Фралоў уступіў у БНФ, Віктара Шалкевіча запрасілі на Ямайку... **Старонка 16.**

## «Пакуты Хрыстовы»


WWW.MOVIEWEB.COM

Ці можна экранізаваць таямніцу збаўленьня? Мэл Гібсан зрабіў фільм, які адны называюць антысэміцкім, другія — жорсткім і натуралістычным, а трэція — шчырай малітвай. Зьмест ацэньваюць па-рознаму, але ўсе сыходзяцца: фільм уражвае і ўплывае. У Рэдакцыі «НН» адбыўся прагляд стужкі.
**Старонка 9.**

ТЫДЗЕНЬ ЖЫЦЬЦЯ

# Ламкоў, лухта і сьвяты

Пасол Беларусі ў Латвіі Ламкоў у інтэрвію тамтэйшаму радыё дагаварыўся да таго, што ў Беларусі жыве… 40 працэнтаў расейцаў. У мінулы чацьвер гэта растыражавалі беларускія СМІ. І што, вы думаеце, МЗС яго папраўў ці ён сам прабачыўся? Ані. Выпадак прыватны, але тыповы. Во так уяўляюць сваю краіну асобныя нашы пасьлы, так яны рэагуюць на публічную крытыку. Увогуле, у палітычных элітах культура бескультур'я, культура лухты стала правілам выжываньня: вярзі абы-што — і табе гарантаваная кар'ера. Называй Быкава паэтам, Карпенку — раскрадальнікам узбэцкае бавоўны, Польшчу — марыянэткавай дзяржавай…

Гэтыя штучкі не выпадковыя. Такую культуру лухты наўмысна песьцяць на дзяржаўным тэлебачаньні і ў газэтах: чым больш блытаніны ў галовах, чым больш міталягізаваная карціна сьвету, тым лягчэй людзей палохаць. Для эўрапейцаў вечны беларускі слоўны панос глядзіцца проста дзіка. Нават вытрыманыя пасьлы Францыі й Польшчы на мінулым тыдні ня вытрымалі, выказалі Яўгену Новікаву пратэст. А мы неяк нават і звыкліся.

Як от звыкліся з дурным правілам напіваціца на сьвяты. От, Вербніца. Што, кажаш, няможна працаваць? Значыць, нада атмеціць. Вялікдзень? Нада атмеціць. Традыцыя само абліччa нашай цывілізацыі. Ад чаго гэта? А з тае ж культуры бескультур'я.

Вялікае сьвята ў нядзелю. Сёлета яно шчасьліва прыпала на адзін дзень у каталікоў і праваслаўных. Такая пацеха, асабліва для мяшаных, каталіцка-праваслаўных родаў: сустрэцца разам. Мы выкарысталі каляндарнае супадзеньне, каб паразважаць у гэтым нумары на тэму адзінства хрысьціянаў. Ці стануць калі «ўсе адзіна»? На пытаньні «НН» адказваюць праваслаўныя і каталіцкія інтэлектуалы, таксама ў Рэдакцыі адбыўся «шматканфэсійны» прагляд фільму Мэла Гібсана «Пакуты Хрыстовы», вакол якога зламана столькі дзідаў.

**Андрэй Дынько**

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Беларусь–Аргентына

**9—11 красавіка ў чвэрцьфінале Кубку Дэвіса Мірны, Ваўчкоў, Швец і Каратчэня сустрэнуцца з аргентынскай зборнай — адной з наймацнейшых тэнісных зборных сьвету. Таму ордэны «За асабістую мужнасьць», якія былі ўручаныя Мірнаму й Ваўчкову напярэдадні, выглядаюць як аванс. Праўда, Гільерма Корыя, 4-я ракетка сьвету, праз траўму ня будзе браць удзелу ў гульнях — калі, вядома, ён не надумаўся скарыстацца «тактыкай Ваўчкова» й нечакана зьявіцца на корце ў самы вырашальны момант. З прычыны траўмы не прыехаў і Давід Налбандзян. Гонар Аргентыны будуць адстойваць Агустын Калеры (27 гадоў, 13-е месца ў рэйтынгу Асацыяцыі тэнісістаўпрафэсіяналаў), Люкас Арнольд (29 гадоў, 21-е месца ў парным разрадзе) (на фота: пасьля прыбыцьця ў Менск). Траўмаваных лідэраў замянілі 20-гадовы Хуан Манака (83-е месца) і 26-гадовы Гільерма Канас (23-е месца). Трымаем кулакі за нашых!**

# Адкрыты ліст Васіля Сёмухі

Газэта «ЛіМ» апублікавала наступную абвестку: «Дзякуем! Рэдакцыя выказвае шчырую падзяку Юрасю Нератку, які ахвяраваў свой ганарар, падпісаўшы на газэту «ЛіМ» дзесяць старэйшых і малазабясьпечаных літаратараў». Атрымаўшы нумар газэты «ЛіМ» (ад 2 красавіка), на якую я не падпісваўся і падпісвацца не зьбіраюся, я зразумеў, што трапіў у сьпіс дзесяці старэйшых і малазабясьпечаных, і радуюся, што сярод нас яшчэ ёсьць добрыя, спагадлівыя і сардэчныя людзі, гатовыя дапамагчы. Я шчыра дзякую сп.Нератку за такія праявы дабрыні і гэтак жа шчыра абураюся паводзінамі газэты «ЛіМ», што эксплюатуе людзкую дабрыню для падвышкі сваёй прэстыжнасьці сярод літаратараў і чытачоў. Я — пэнсіянэр і, дзякуючы «ацечаскай забоце», дастаткова забясьпечаны, каб мог дазволіць сабе лічыць за гонар і шчасьце не чытаць холдынгавых выданьняў, не друкавацца ў іх і тым больш не падтрымліваць іх сваёй падпіскай. Я, натуральна, не зьбіраюся судзіцца зь «ЛіМам» і холдынгавым начальствам ды патрабаваць маральнай кампэнсацыі за абразу — Бог вам судзьдзя і той, каго вы сабе за бога маеце, — і, як што гаварыць пра нейкую мараль у падобнай сытуацыі аніяк не выпадае, толькі патрабую выключыць мяне зь любых сьпісаў вашых прыхільнікаў і віватоўцаў.

**Васіль Сёмуха,**
літаратар-перакладчык,
ляўрэат Дзяржаўнай
прэміі імя Якуба Коласа

# Бывай, «Маладосць»

**З красавіка вы больш ня купіце выданьняў холдынгу «Літаратура і мастацтва»: аднайменнай газэты й часопісаў «Полымя», «Маладосць», «Всемирная литература» і «Нёман». Зараз на іх можна будзе толькі падпісацца.**
**А беларускамоўныя выданьні ў шапіках можна будзе палічыць на пальцах.**

Рэдактар тыднёвіка «ЛіМ» Анатоль Казлоў тлумачыць рашэньне эканамічнымі прычынамі: «Вырашылі распаўсюджвацца толькі праз падпіску, каб не працаваць напустую. Каму цікава, той падпішацца». На эканоміцы робіць акцэнт і кіраўнік «Белсаюздруку» Міхаіл Падгайны: «Мы — камэрцыйная структура, якая займаецца распаўсюджваньнем тавару. Што датычыць установы «ЛіМ», дык мы пагадзіліся распаўсюджваць іх прадукцыю пад гарантыі продажу. Дагэтуль у іх былі вельмі вялікія сьпісаньні».

Незалежны часопіс «Arche» праблемаў са сьпісаньнем ня мае, яно невялікае. Яго рэдактар Валер Булгакаў праводзіць паралелі з Украінай: «Там ад продажу літаратурна-мастацкіх выданьняў у шапіках адмовіліся ўжо даўно, бо яны загадзя лічацца непрыбытковымі». Рэдактар «Arche» лічыць імавернай адмову «Белсаюздруку» ад усіх літаратурна-мастацкіх выданьняў. Ад такой палітыкі пацярпеў ужо незалежны часопіс «Дзеяслоў», які ў «Белсаюздруку» адмовіліся браць на распаўсюд. «Нам сказалі, што ў шапіках утвараюцца проста горы «Полымя», «Маладосці». Маўляў, літаратурна-мастацкія выданьні не карыстаюцца попытам. Так што мы фактычна пацярпелі за тыя выданьні», — распавёў рэдактар часопісу Барыс Пятровіч.

На думку В.Булгакава, вінаватыя ў сёньняшняй сытуацыі й самі беларускія інтэлектуалы, якія ня здолелі стварыць якасны канкурэнтаздольны «глянцавы» прадукт, які б выгадна глядзеўся на вітрынах. З гэтага гледзішча вяртаньне літаратурных выданьняў у шапікі, на якое спадзяецца А.Казлоў, падаецца ілюзорным: «Паглядзім на сытуацыю — магчыма, адновім продаж. Тым болей што тыражы ў нас пастаянна павялічваюцца». Няма сумневу, што сыход літаратурна-мастацкіх выданьняў з шапікаў ударыць па накладах: пацерпяць чытачы, якія куплялі часопісы нерэгулярна.

Праўда, М.Падгайны ня лічыць літаратурныя часопісы апрыёры непрыбытковымі — «Белсаюздрук» распаўсюджвае нават кнігі. Але ў шапіках беларускіх кніг ня знойдзеш: «Беларускую мастацкую літаратуру ў кіёскі не выстаўляюць, там прадаецца пераважна літаратура фармату покет-бук: прачытаў і выкінуў. А беларуская літаратура выдаецца больш фундамэнтальна».

**Аркадзь Шанскі**

# Ліцэю адмовілі

Выкладчыкі зачыненага ўладамі Беларускага ліцэю не дабіліся магчымасьці дзейнічаць легальна. Упраўленьне юстыцыі Менгарвыканкаму не зарэгістравала грамадзкага аб'яднаньня «Беларуская гуманітарная адукацыя — XXI ст.».

Увосені ўлады адмовіліся рэгістраваць грамадзкае аб'яднаньне «Беларускі ліцэй». Супраць выступіла Міністэрства адукацыі: маўляў, словам «ліцэй» можа пазначацца толькі навучальная ўстанова. Тады настаўнікі падалі ў органы юстыцыі дакумэнты ад «Беларускай гуманітарнай…». Чатыры месяцы спатрэбілася юрыстам, каб адмовіць: нібыта назва не адпавядае арт.12 «Закону аб грамадзкіх аб'яднаньнях».

«У прыватнай гутарцы юрыст нам патлумачыў, што слова «беларускі» не адпаведнае для гарадзкой арганізацыі. Але мы ад яго адмаўляцца не зьбіраемся, бо нашая аснова — менавіта беларускамоўная адукацыя», — кажа прафэсар Міхась Тычына, старшыня ініцыятыўнай групы. Выкладчыкі маюць абскардзіць рашэньне ў гарадзкім судзе.

**АШ**

## Паўстаньне ў Іраку

У Іраку працягваецца паўстаньне шыітаў. Баі ідуць у Багдадзе, Фалуджы, Наджафе, Карбале. Украінскія часьці, страціўшы аднаго байца забітым і пяць параненымі, пакінулі Кут. Шыіты дамагаюцца вываду замежных войскаў з краіны і пераўтварэньня Іраку ў ісламскую рэспубліку. Кааліцыя страціла забітымі 15 салдатаў.

## «5+» выклікае Лукашэнку

Народная кааліцыя «5+» выклікае Лукашэнку на дыскусію ў жывым тэлеэтэры. Пра гэта гаворыцца ў заяве лідэраў «пяцёркі», распаўсюджанай 6 красавіка. «Стала традыцыяй», — пішуць яны, што Лукашэнка, «не адказвае за свае словы і не абцяжарвае сябе пошукам доказаў». Аўтары заявы прапануюць прэзыдэнту «набрацца сьмеласьці і выйсьці на сьвет, да людзей», якіх ён «палівае гразёй».

## Арыштаваны забойца беларусаў

Стакгольмская паліцыя арыштавала чалавека, абвінавачванага ў забойстве двух беларусаў-эмігрантаў. Гэта швэд 34 гадоў, раней судзімы. 1 красавіка на гарадзкім сьметніку знайшлі целы двух беларусаў: аднаму было 35 год, другому — каля 20, і ён толькі два тыдні як прыляцеў у Швэцыю зь Менску.

## Сянько на Эўразьвяз

Экс-міністар замежных справаў Беларусі Ўладзімер Сянько, які быў паслом у Францыі, прызначаны на важную пасаду пасла ў Бэльгіі і пры Эўразьвязе.

## Хамайда адракаецца РБ

Барыс Хамайда, актывіст Кансэрватыўна-хрысьціянскае партыі БНФ зь Віцебску, хоча застаца грамадзянінам БНР і не жадае атрымліваць беларускі пашпарт новага ўзору. Падтрымаць сваю акцыю супрацiву ён просіць усіх, хто мае даведку пра грамадзянства БНР. Пра сваё нежаданьне атрымліваць пашпарт грамадзяніна РБ Барыс Хамайда заявіў міліцыянтам з райаддзелу, якія даслалі яму позву з напамінам пра неабходнасьць замяніць дакумэнт.

## Музэй шкодных звычак

адчыніўся ў Гомельскай бібліятэцы №8. Экспанатамі там шпрыцы, імітацыя наркотыкаў, цыгарэтныя пачкі, абгорткі слодычаў. Бібліятэкаркі такім чынам тлумачаць дзецям шкоду гэтых захапленьняў. Дзеці экспазыцыяй зацікавіліся: усе экскурсіі на бліжэйшы час расьпісаныя.

## Карыда па-за законам

Гарадзкая рада Барсэлёны прагаласавала за забарону карыды — адмысловага віду спорту, гісторыя якога налічвае стагодзьдзі. Рашэньне было прынята пасьля таго, як гарадзкая рада атрымала пэтыцыю за подпісамі 250 тыс. чалавек з усёй Эўропы. Каталёнцы, дарэчы, і ня лічаць гэтую кастыльскую забаву сваёй.

## Якая дзяржава, такі і Шварц

На абраньне коміка Еўдакімава губэрнатарам Алтайскага краю адгукнуўся расейскі сайт anekdot.ru. «Новаабранага губэрнатара Еўдакімава параўноўваюць з Шварцэнэгерам — якая дзяржава, такі й Шварцэнэгер!»

**МБ; БелаПАН; радыё «Свабода»**

# Халопік прарасейскі

**Дэпутат Халопік адстойвае справу інтэграцыі з Расеяй. Ягоныя калегі па дэпутацкай групе «СЭР» лічаць гэтыя выказваньні «асабістай думкай».**

Лідэр дэпутацкай групы «Спрыяньне эканамічным рэформам» (СЭР) Кірыла Халопік выступіў з крытыкай праграмы дзеяньняў ураду на 2004 год. У прапанаваным кабінэтам Сідорскага на зацьвярджэньне ППНС традыцыйным законапраекце «Аб асноўных кірунках замежнай і ўнутранай палітыкі Беларусі» «інтэграцыйны» пункт упершыню адсутнічаў. Няма і плянаў уводзіць з 2005 г. расейскі рубель. Стратэгія адносінаў з адзіным саюзьнікам уклалася ў адзін абзац: «Супрацоўніцтва з РФ у сфэры замежнаэканамічнай дзейнасьці будзе скіраванае галоўным чынам на рэалізацыю праграмы дзеяньняў РБ і РФ па рэалізацыі дамовы пра стварэньне саюзнай дзяржавы. Атрымаюць далейшае разьвіцьцё гандлёва-эканамічныя дачыненьні з рэгіёнамі Расеі. Асаблівая ўвага ўраду будзе нададзеная рэалізацыі мерапрыемстваў па супрацоўніцтве з Масквой». Вось і ўсё.

Калі б не К.Халопік, на нудны штогадовы дакумэнт, магчыма, ніхто, акрамя замежных дыпляматаў, не зьвярнуў бы ўвагі. Пункт аб прыярытэтным партнэрстве з Расеяй мусіць вярнуцца ва ўрадавы дакумэнт! Гэтую думку дэпутат агучваў публічна, і ня раз, што ў рахманай палаце здаралася рэдка. К.Халопік мяркуе, што праблема палягае ў нежаданьні беларускіх уладаў уніфікаваць заканадаўства з Расеяй.

Дэпутат ад Століншчыны Іван Пашкевіч ня схільны ўвязваць «інтэграцыйнасьць» калегі зь ягонымі выбарчымі плянамі. «Халопік зьяўляецца аўтарам альтэрнатыўнага законапраекту «Аб асноўных кірунках замежнай і ўнутранай палітыкі Беларусі», праз кожны артыкул якога чырвонай ніткай праходзяць інтэграцыйныя настроі з Расеяй. Цяпер і праект Халопіка, і ўрадавы законапраект абмяркоўваюцца ў дэпутацкіх групах. Асабіста я аддаю перавагу праекту Саўміну», — сказаў І.Пашкевіч.

Ён ня ведае, інтэграцыйны пыл — асабістая ініцыятыва дэпутата Халопіка або пазыцыя нейкай групы. Разам з тым, Іван Пашкевіч скептычна ставіцца да думкі, што калега адлюстроўвае інтарэсы расейскага бізнэсу. «Эканамічныя адносіны з Расеяй склаліся такія, што быць лабістам буйных расейскіх кампаній можа толькі адзін чалавек у краіне — кіраўнік дзяржавы», — падкрэсьліў І.Пашкевіч.

Былы дырэктар Выгалавіцкай птушкафабрыкі, сябар дэпутацкай групы «Рэспубліка» Ігар Баслык таксама лічыць, што «інтэграцыя з Расеяй — адзін з галоўных прыярытэтаў у дзейнасьці ўраду. Але не галоўны». Увогуле, лічыць сябар «Рэспублікі», «Беларусь губляе стратэгічнага партнэра ў асобе Расеі і становіцца буфэрнай зонай паміж Расеяй і NATO. Відаць, у Халопіка былі прычыны зрабіць падобную заяву». Аднак называць тыя самыя прычыны дэпутат не стаў.

Сябар групы «СЭР» Андрэй Нарэйка засьцерагае, што заявы кіраўніка групы — асабістая думка дэпутата К.Халопіка. «Перш чым рабіць гэтыя заявы, Кірыла Халопік не абмяркоўваў праблемы з усёй групаю, — сказаў дэпутат. — Гэта ягоныя асабістыя перакананьні». Зрэшты, і А.Нарэйка мяркуе: «Акцэнты ў адносінах з Расеяй варта расставіць».

Напярэдадні выбараў такія заявы з боку дэпутата, які зьбіраецца паўторна змагацца за мандат, выглядаюць і выклікам, і праграмным крокам. Такім чынам, прарасейская партыя фармуецца не сярод дэмакратычнае апазыцыі, чым доўга палохалі дзяржаўныя СМІ, а ў самім аплоце лукашэнкаўцаў. А на чале яе праявіўся дэпутат зь непрэзыдэнтабэльным прозьвішчам.

**_Глеб Хмяльніцкі_**

# Віктара Шэймана са справаздачай

Кожны раз, калі дыктар «Панарамы» паведамляе: «Сёньня прэзыдэнт Рэспублікі Аляксандар Лукашэнка прыняў з дакладам генэральнага пракурора Віктара Шэймана», — тысячы людзей заміраюць каля тэлевізараў.

Ня толькі людзей маленькіх — безабаронных перад кожнай чарговай дырэктывай аб павышэньні адказнасьці за прыпіскі на камбікормавых заводах. А і людзей вялікіх. Прынялі Шэймана — узбуджаная справа супраць Казуліна. Прынялі яшчэ раз — сеў ганарысты Рыбакоў. Выяўленыя злоўжываньні ў Берасьці: выбірай, Даўгалёў, сьцежку фартуны. Праінфармаваў Шэйман прэзыдэнта аб тым, колькі даляраў скраў банкір Краўцоў, дык што, вы думаеце, знойдзецца такі судзьдзя, які наважыцца ўсумніцца ў высновах сьледзтва? Так, як баяцца Шэймана, апошні раз баяліся пры Савецкім Саюзе.

З крахам праекту беларуска-расейскай інтэграцыі барацьба з карупцыяй ізноў выйшла на перадавую ва ўнутранай палітыцы: законапраект аб барацьбе з карупцыяй у дзяржаве ўнёс на разгляд палаты прадстаўнікоў сам прэзыдэнт. Аднак праект выклікаў пратэст апазыцыйна настроенай часткі дэпутатаў. Яны бачаць у ім небясьпеку для раўнавагі ў сыстэме сілавых структураў.

Паводле праекту, галоўнай зь іх мае стаць пракуратура, на якую ўскладаюцца функцыі каардынацыі дзейнасьці Дзяржкантролю, МУС і КДБ і якой даюцца надзвычайныя паўнамоцтвы. «Як у 37-м годзе», — кажа Ўладзімер Парфяновіч.

Да законапраекту ёсьць і чыста юрыдычныя прэтэнзіі. Начальнік экспэртна-прававога ўпраўленьня нацыянальнага сходу В.Рэут зьвяртае ўвагу на шматлікія недарэчнасьці. Дзеяньне закону пашыраецца на дзьве катэгорыі асобаў: «дзяржаўных службовых асобаў» і «асобаў, прыраўнаваных да дзяржаўных службовых асобаў». Прыраўноўваньне прадугледжвае роўны статус абедзьвюх катэгорыяў, хаця адказнасьць — розная. Праект называе правапарушэньні, якія ствараюць «умовы для карупцыі», а вось адказнасьці не ўстанаўлівае. І гэтыя нормы не стасуюцца з Кодэксамі: склады злачынстваў там сфармуляваныя інакш, а адказнасьці за некаторыя з правапарушэньняў увогуле няма.

Пытаньні экспэрты маюць і да тэрміналёгіі праекту. Тэрмін «карупцыя» мусіць удакладняцца — у прыватнасьці, трэба дакладна сфармуляваць панятькі «подкуп», «заступніцтва», «абяцаньне перавагаў», «бо яны могуць быць вытлумачаны занадта шырока».

Намесьнік старшыні камісіі па нацыянальнай бясьпецы палаты Іван Кібак не турбуецца тым фактам, што закон так пашырае паўнамоцтвы пракуратуры. Хаця дэпутат не выключае, што працэс перазьмеркаваньня паўнамоцтваў паміж пракуратурай і КДБ, МУС, КДК можа аказацца балючым. Таму і прапаноўваў дэпутат, каб толькі «адна дзяржаўная структура займалася барацьбой з карупцыяй».

Дэпутат-генэрал Валеры Фралоў расцэньвае законапраект як працяг палітыкі закручваньня гаек, распачаты дысцыплінарнай дырэктывай №1. «Любы чалавек, які сходзіць у лазьню зь некім, у патрэбны момант можа быць названы карупцыянэрам. Улада стварае глебу дзеля таго, каб любога чалавека ў любы патрэбны момант можна было прыцягнуць да пэўнага ўзроўню адказнасьці».

Небясьпека барацьбы за першынство паміж сілавымі структурамі з прыняцьцем закону ўзрастае. В.Фралоў мяркуе, што «пракуратура і так мае дастатковыя паўнамоцтвы. Надзяленьне яе шырэйшымі паўнамоцтвамі тлумачыцца толькі асобай Шэймана, які знаходзіцца ў цесных адносінах з прэзыдэнтам».

У такім разе ўся задуманая рэформа падладжаная пад патрэбы двух чалавек, адзін зь якіх прымае другога раз на два тыдні. Яны лічаць, што маюць права і здольнасьць самастойна вырашаць лёс асобных людзей і краіны. Проста і хутка. Усялякія іншыя «складаныя» структуры, нават спэцслужбы і суды, у такім разе вымушаныя сваімі паўнамоцтвамі дзяліцца і проста старанна ўслухоўвацца ў паведамленьне, колькі ж там скраў банкір Краўцоў. Яны, як колісь парлямэнт, перастаюць штосьці вырашаць, а пачынаюць проста выконваць.

**_Глеб Хмяльніцкі, Мікола Бугай_**

Што такое карупцыя? Законапраект вызначае яе як выкарыстаньне дзяржаўнай асобай свайго службовага становішча для проціпраўнага атрыманьня выгады.

# Новікава дырэктарам, Новікаву пад суд

**Нядаўна амніставанай 32-гадовай мянчанцы Аксане Новікавай ізноў пагражае арышт. 6 красавіка Транспартная пракуратура Менску ўзбудзіла супраць яе новую крымінальную справу па арт.367 КК — «паклёп на прэзыдэнта».**

5 красавіка апоўдні ў тунэлі чыгуначнага вакзалу Аксана Новікава «публічна дэманстравала ўлёткі, выробленыя памнажальным спосабам, раздаючы іх людзям. Названыя лістоўкі ўтрымліваюць паклёпніцкія зьвесткі, якія ганьбяць прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі, спалучаныя з абвінавачаньнем у асабліва цяжкіх злачынствах», — гаворыцца ў пастанове аб узбуджэньні крымінальнае справы, падпісанай транспартным пракурорам Менску, дарадцам юстыцыі А.Лашыным.

Сумна вядомы артыкул сьцьвярджае: паклёп у адносінах да прэзыдэнта, зьдзейсьнены асобай, ужо раней за гэта судзімай, караецца абмежаваньнем волі або турмой на тэрмін да пяці гадоў.

Што ж за ўлёткі выклікаюць такую рэакцыю? У іх дысыдэнтка піша пра зьнікненьні апазыцыйных палітыкаў і магчымае дачыненьне прэзыдэнтуры да гэтага, а таксама пра меркаваньні пазабюджэтныя фонды, падкантрольныя прэзыдэнту. Першы допыт А.Новікавай быў прызначаны на другую палову дня 7 красавіка.

**_Глеб Хмяльніцкі, МБ_**

## Сыгнал Калякіну

Колішні сакратар Партыі камуністаў і лідэр антыпрэзыдэнцкае апазыцыі ў 1996 г. Васіль Новікаў стаў дырэктарам Інстытуту філязофіі НАН. Новікаў мае навуковую ступень доктара філязофскіх навук. Яго прыход на пасаду супаў зь сьмерцю папярэдняга дырэктара інстытуту — Альфрэда Майхровіча. Аднак загад пра прызначэньне быў выдадзены яшчэ 10 сакавіка — пры жыцьці папярэдніка.

У гэтым прызначэньні бачыцца сыгнал лідэрам ПКБ, якую некаторыя лічаць слабым зьвяном дэмакратычнае кааліцыі «Пяцёрка-плюс».

# Жэрміналю ня будзе



**З красавіка ў Менску адбыўся форум «Будучыня левых у Беларусі». Пабываўшы на ім, я нарэшце зразумеў прычыну развалу СССР.**

Дэфіцыт гарэлкі, подступы ЦРУ і калдырны путч ні пры чым. Савок ляснуўся таму, што Шушкевіч, Краўчук і Ельцын былі ў душы (як гэта высьветлілася пазьней) сацыял-дэмакратамі.

Палітычная культура нашай сацыял-дэмакратыі загадкава схільная да нематываваных канфрантацый і канфліктаў. Вось і ў суботу: не пасьпеў пачацца форум, як тав.Шушкевіч зачытаў ноту пратэсту супраць пранікненьня на канфэрэнцыю прайдзісьветаў, якія прыкрываюцца партквіткамі яго БСДГ. Пасьля чаго ён эфэктна пакінуў залю.

Як і трэ было чакаць, левай Антанты не атрымалася. За адсутнасьцю Шушкевіча, форум зьвёўся да дзяжурнай канстатацыі рознагалосьсяў паміж дзьвюма фракцыямі беларускіх левацэнтрыстаў. Партыя працы, БСДГ і ПКБ мусолілі тэзыс, што рашэньне сацыяльных праблемаў магчымае выключна ў фармаце агульнадэмакратычных рэформаў. Асабліва пацешыў Калякін, які абвясьціў, што ПКБ — партыя левацэнтрыстаў. І ты, Брут, прадаўся Эбэрту!

Статкевіч прыармяніў сацыяльнае пытаньне да геапалітыкі: як увойдзем у ЭЗ — нам абломіцца сацыялізм.

На фуршэце пасьля трэцяй у галаву мне разам з градусам стукнула эўрыка. Шкада, што ў нашых левых партыях ня ўведзены пост «чалавека з народу». Нейкі сугрмадзянін зь нізоў, які змог бы тэставаць усе акцыі на прадмет патрэбаў пралетарыяту. Вось бальшавікі, калі ехалі заключаць Берасьцейскі мір, не забыліся прыхапіць на плятформе Аляксандраўскага вакзалу нейкага бамжа як эманацыю працоўных масаў. Падчас перамоваў зь немцамі ён сядзеў, жраў халяўную гарэлку і ўважліва глядзеў, каб Троцкі нечага не напартачыў.

Каб такі Шарыкаў прысутнічаў на форуме, ён бы адразу паклаў канец бессэнсоўным размовам наконт аб'яднаньня. Народу гэта незразумела і не патрэбна.

Наша сацыял-дэмакратычная эліта нагадвае экіпаж «Баўнці» — мяцежнага карабля, які доўгі час блукаў па прасторах Ціхага акіяну. У выніку ваяжу матросы настолькі абрыдлі адзін аднаму, што пачалася панажоўшчына. Той самы псыхалягічны эфэкт назіраецца і на левацэнтрысцкім флянгу, толькі замест кінжалаў і мачэтэ ў ход ідуць рэзалюцыі і дэмаршы.

У такой сытуацыі левыя павінны браць прыклад з правых. Паглядзеце на БНФ. Яго твар усё больш вызначаюць «зялёныя» кшталту Міхалевіча-Янукевіча і Лялькова. У той жа час маладыя «ружовыя» — што тыя мільтаны пры двары Генрыха IV. Шушкевіч, Статкевіч і Бухвостаў, дайце маладым на тры дні мандат кіраўнікоў, і ўжо праз паўгадзіны яны будуць піць шампанскае за новую «Адзіную Беларускую Сацыял-Дэмакратыю». Усіх праблемаў.

**_Лёлік Ушкін_**

# Намесьнікі цара па рэвалюцыі

## Ліст Хадаркоўскага і лёсы лібэралізму

**За грошы ўладу можна купіць толькі там, дзе да грошай маецца павага. Рэформы 1990-х ня выкаранілі традыцыі браць сілай тое, за што ў прыстойным грамадзтве плацяць грошы. Да шматлікіх лібэралаў «на паслугах» ва ўлады дадаўся магнат Хадаркоўскі.**

Артыкул расейскага алігарха і найбагацейшага зэка ў сьвеце Міхала Хадаркоўскага аб крызысе расейскага лібэралізму зьявіўся на тым тыдні ў газэце «Ведомости» і выклікаў эфэкт бомбы. Хадаркоўскі заклікаў сваіх паплечнікаў пераасэнсаваць досьвед і вынікі рэформаў 1990-х, пакаяцца перад народам ды ўладамі за нанесеную шкоду і хлусьню, падзяліцца грашыма, каб легітымізаваць вынікі прыватызацыі. А галоўнае, набат не імкнуцца ваяваць з Крамлём і асабіста Пуціным, якога экс-алігарх бачыць гарантам захаваньня лібэральнага курсу хоць у нейкай форме.

Нагадвае пакаянныя лісты сталінскага часу. А эвалюцыя палітычных поглядаў зьняволенага багацея нагадвае «перакоўку» клясавага ворага.

Беларускі і расейскі лібэралізм даволі шчыльна зьвязаны. І менавіта з разьвіцьцём палітычных падзеяў ды эканамічных рэформаў шмат хто з прыхільнікаў ідэяў Фрыдмана ды Гаека зьвязваў лёс пераменаў у самой Беларусі. Таму гэты ліст — важная зьвя і для палітычных працэсаў унутры нашай краіны: як мінімум, ён дазваляе лепш зразумець, што адбываецца ў нашых суседзяў.

Хадаркоўскі ня проста зрабіў паварот на 180 градусаў. Гэтымі высновамі ён падставіў сваю былую палітычную кліентуру ў той час, калі яго ўжо ператварылі ў сьцяг супраціву пуцінскаму аўтарытарызму. Акрамя таго, Хадаркоўскі цалкам легітымізаваў палітычную практыку ды палітычны дыскурс сучаснай Расеі. Пакаяньне прадпісанае не камуністам і не супрацоўнікам КГБ, а лібэралам. Адказнасьць за парушэньне закону ды наступ на дэмакратыю ў сучаснай Расеі перакладаецца зусім не на тых, хто ў гэтым наўпрост вінаваты. Пад «нацыянальнымі інтарэсамі», у кантэксьце якіх мусіць рэалізавацца новы лібэральны праект, празрыста разумеюцца інтарэсы дзяржаўнай бюракратыі ды самога Пуціна. Нарэшце, Хадаркоўскі абыходзіць бокам пытаньне, ці сапраўды пуцінская ўлада будзе дамагацца таго, каб алігархі дзяліліся з грамадзтвам. Бо сыпс найбагацейшых людзей сьвету няспынна папаўняецца расейскімі магнатамі, а саджаюць толькі тых, хто праявіў палітычныя амбіцыі. Недарэчнейшым за артыкул Хадаркоўскага быў хіба пакаянны ліст Мікалая II аб крызысе расейскае манархіі ды праваслаўя за дзьве гадзіны да расстрэлу.



КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

### Прыдворныя лібэралы

Так што элемэнт калі не «прагіну», то прызнаньня паразы, безумоўна, ёсьць. Аднак, як любы гулец, Хадаркоўскі разумее, што няма сэнсу даводзіць прайграную партыю да мату — разумней здацца і пачаць новую. Прычыны ягонай капітуляцыі нашмат глыбейшыя, чым уласнае зьняволеньне. Яны знаходзяцца ў прыродзе і лёсе ўсіх папярэдніх расейскіх лібэральных праектаў.

Расейскае грамадзтва ніколі не было асабліва лібэральным, але гісторыя рэформаў у Расеі досыць багатая. Усе яны праходзілі ў фармаце «прыдворнага лібэралізму».

Расейскія эліты неаднаразова асэнсоўвалі неабходнасьць мадэрнізацыі і вэстэрнізацыі краіны ва ўмовах, калі безнадзейнасьць яе адставаньня ад заходняга сьвету была відавочнай. На эвалюцыйны шлях ніколі не хапала ані часу, ані цярпеньня. Таму мадэрнізатарскія праекты заўжды праводзіла «моцная рука», якой прыслужвалі аўтары рэфарматарскіх праектаў. З аднаго боку, любыя рэформы натыкаліся як на супраціў кансэрватараў, так і на нежаданьне радыкалаў чакаць. Рэформы Сьперанскага, Аляксандра II, Сталыпіна абрываліся ці зь першай, ці з другой прычыны.

Зь іншага боку, рэформы ўвахodзілі ў супярэчнасьць з уладнымі інстынктамі саміх рэфарматараў, якія не жадалі пазбавіцца ўлады ў выніку ўласных пераўтварэньняў. У выніку раз за разам рэпрадукавалася сытуацыя, у якой адзіным расейскім лібэралам заставалася дзяржава. Пуцін — яшчэ адзін эпізод, які пацьвярджае правіла. Ён далёка ня першы расейскі лідэр, які, кажучы словамі Хадаркоўскага, хоць і не зьяўляецца ні лібэралам, ні дэмакратам, усё ж такі лібэральнейшы за 70% грамадзтва. Зрэшты, калі палітычная культура ўладароў ды падданых у Расеі супадала, яна атрымлівала іванаў жахлівых, сталіных ды мікалаяў палкіных.

### Ад Ельцына чакалі цудаў

Працяг традыцыі «прыдворнага лібэралізму» ў пуцінскія часы быў запраграмаваны тым фактам, што рэформы 1990-х не прывялі да стварэньня ў Расеі лібэральнага грамадзтва. Ці былі гэтыя рэформы лібэральнымі — пытаньне іншае. Але камуністы таксама дагэтуль сьцьвярджаюць, што іх ідэі былі правільныя, толькі дрэнна зрэалізаваныя. У любым выпадку, ельцынскія рэформы прайшлі па старой палітычнай формуле «цар—найміты», у якой лібэральныя інтэлектуалы-тэхнакраты абслугоўвалі палітычную замову, але не зьяўляліся самастойнай сілай.

Расейскія рэформы ня мелі шырокай сацыяльнай базы — яе першапачаткова меў толькі сам Ельцын, ад якога чакалі цуду як ад чарговага «добрага цара». Яны таксама ня мелі такой моцнай культурна-гістарычнай легітымнасьці, як рэформы ў краінах Цэнтральнай Эўропы. Там эканамічны лібэралізм талеравоўся насуперак грамадзкай незадаволенасьці. Чарговыя генэрацыі ўладных элітаў бачылі ў ім сродак, што забясьпечвае вяртаньне ў заходнюю цывілізацыйную прастору, у межах якой і фармавалася нацыянальная ідэнтычнасьць гэтых народаў.

Расейскія ж лібэральныя эліты былі вымушаныя пайсьці прыслужваць, фактычна паразытуючы на тым самым адміністрацыйным рэсурсе, у злоўжываньні якім яны цяпер вінавацяць пуцінскую вэртыкаль. Дый супэрпрэзыдэнцкая ўлада была створаная якраз для выкананьня палітычнай замовы. Створаная пры падтрымцы лібэральнай плыні, што на ўладзе паразітавала. Пуцін да гэтай сыстэмы мала што дадаў. Ён проста рэалізаваў магчымасьці, закладзеныя пры Ельцыну.

Расейскі лібэралізм пазбавіўся ўласнай сацыяльнай базы ў паельцынскую эпоху. Істотным сацыяльным вынікам папярэдніх рэформаў стала стварэньне невялікай і дагэтуль кволай сярэдняй клясы. Гэтая лібэральная субкультура, паводле самых аптымістычных падлікаў сацыёлягаў, налічвае прыкладна 17% расейскага грамадзтва. Нават пры поўнай рэалізацыі палітычнага патэнцыялу лібэралам застаецца альбо быць у вечнай апазыцыі, альбо вяртацца ва ўслужэньне да «самага галоўнага лібэрала» — прэзыдэнцкай улады. Больш дакладна — да самога Пуціна. Апазыцыйны шлях уяўляецца самым праблематычным.

Лібэральная субкультура ў Расеі сёньня напалову пуцінская. І гэта ня ёсьць наступствам таго, што Пуцін маніпулюе сваім іміджам, паўстаючы для адной часткі насельніцтва нашчадкам Сталіна ды Дзяржынскага, для другой — ледзь ня Маргарэт Тэтчэр у нагавіцах. Новая расейская сярэдняя кляса — сацыяльная база палітычнага лібэралізму — здабыла пры Пуціну непараўнальна больш, чым пры Ельцыну, Гайдару ды Чубайсу. Нізкія падаткі, пакупніцкі попыт для разьвіцьця бізнэсовай актыўнасьці, нарэшце, тая ж палітычная стабільнасьць.

Палітычная параза алігархіі тлумачыцца проста: за грошы ўладу можна купіць толькі там, дзе да грошай маецца павага. Тут можна прыгадаць цытату з Аляксандра Пушкіна, якая трапна фармулюе суадносіны паміж багацьцем ды ўладай у Расеі: «Все мое, сказало злато, Все мое, сказал булат. Все куплю, сказало злато, Все возьму, сказал булат».

Рэформы 1990-х у Расеі ня выкаранілі традыцыю браць сілай тое, за што ў прыстойным грамадзтве плацяць грошы. А юрыдычная нялэўнасьць і сацыяльнае непрыняцьце вынікаў прыватызацыі надало дадатковую легітымнасьць шарыкаўска-швондзерскім настроям у расейскім грамадзтве. Уласнасьць і ўплыў алігархаў сталіся закладнікамі жаданьня ці нежаданьня ўладаў выцягваць тэму легітымнасьці капіталаў на публіку.

### Што зразумеў Хадаркоўскі за кратамі

Калі скласьці ўсе гэтыя фактары, стане зразумелым, што падставаў для рэалізацыі чарговых лібэральных праектаў па-за сыстэмай пуцінскай улады ў Расеі няма. Самі ж па сабе гэтыя праекты цалкам залежаць ад палітычнай волі і плянаў Пуціна. У гэтых умовах канфрантацыйныя, апазыцыйныя, нават дысыдэнцкі шлях разьвіцьця расейскага лібэралізму можа пагражаць яму канчатковым самазьнішчэньнем.

Хадаркоўскі на зоне, безумоўна, меў больш шанцы ацаніць свае рэальныя палітычныя магчымасьці, чым яго былая кліентура на волі. Але ягоны ліст — ня проста спроба пакаяньня ці прапанова палітычнага ці фінансавага «адкату» Крамлю. Зэк-мільярдэр зрабіў заяўку на тое, каб узначаліць палітычную плынь гэтага новага, пракрамлёўскага лібэралізму, каб стаць спэцыяльным «намесьнікам цара па рэвалюцыі». Наўрад ці Пуцін адклікнецца ды выпусьціць яго на волю, даўшы шанец вярнуцца ў палітыку, няхай далёка і ня ў той ролі, у якой Хадаркоўскі калісьці бачыў сябе. Але нават калі ён выйдзе і вернецца, сама лёгіка «прыдворнага лібэралізму» ставіць яго пад пагрозу. Ці працягнецца пуцінская лінія пасьля 2008 г. і ці ня будзе вымушаны Хадаркоўскі зноў прымерыць турэмную робу? Мо новаму лідэру захочацца рэалізаваць ці не лібэральныя праекты — таксама ж спатрэбіцца вінаватыя. Як Пуціну спатрэбіўся ў гэтай ролі Хадаркоўскі.

А што ж Беларусь? Тут ізноў варта зьвярнуцца да гісторыі. «Прыдворны лібэралізм», які рэалізуецца ў кантэксьце нацыянальных інтарэсаў Расеі, ніколі не экспартаваўся на памежныя тэрыторыі. Ён хутчэй зьяўляўся прыкрыцьцём экспарту на іх Расеі. Астатняе зразумела.

**Віталь Сіліцкі**

# Якім ён хлопцам быў!



У Беларусі ў 1996 г. быў шанец стаць першай эўрапейскай краінай, у якой адбылася працэдура імпічмэнту. Першай такой краінай стала, аднак, у 2004 г. суседняя Літва. І хоць Раландас Паксас шмат у чым адрозьніваецца ад Аляксандра Лукашэнкі, гісторыя палітычнага падзеньня літоўскага прэзыдэнта дае падставы лішні раз паразважаць над учарашнім і сёньняшнім днём Беларусі.

Для таго, каб у свой час распачаць працэдуру імпічмэнту, не хапіла ўсяго некалькіх подпісаў дэпутатаў Вярхоўнага Савету. І яшчэ — мужнасьці тагачаснага старшыні Канстытуцыйнага суду ды некаторых судзьдзяў. А яшчэ — пасьлядоўнасьці кіраўніцтва парлямэнту, рашучасьці й сьмеласьці апазыцыі. Іншымі словамі — не было ўмоваў, пры якіх гэта стала б магчымым. Не было дэманстрацыяў за адстаўку кіраўніка дзяржавы, як, дарэчы, і супраць. Грамадзтва да гэтага тады проста не сасьпела.

Прыклад сёньняшняй Літвы паказвае, якая цяжкая гэта справа — дэмакратычная працэдура. Быў момант — паміж ініцыятывай імпічмэнту ў Сойме і разглядам справы ў Канстытуцыйным судзе, — калі здавалася: нічога ня будзе. Нават штодзённая прэса быццам стамілася пісаць аб справе Паксаса. Некаторыя зь беларускіх журналістаў, абазнаных у літоўскае сытуацыі, упэўнена казалі: справу спусьцяць на тармазах.

І вось гэты дзень настаў. Назваць яго днём трыюмфу дэмакратыі нельга не выпадае. Усё-такі ў нашыя дні гэта хутчэй дэмакратыя па-эквадорску ці па-пэруанску, чым па-эўрапейску. Адстаўка выглядала б куды больш прыстойна, чым сутаргавыя рухі кшталту прызначэньня расейскага бізнэсоўца памочнікам прэзыдэнта, а ўсяго праз некалькі гадзінаў — публічная адрачэньня ад свайго былога сябра.

Але ў Паксаса заставалася вера ў сваю ўсенародную абранасьць ды папулярнасьць. І часам здавалася, што ў яго былі падставы ў гэта верыць — асабліва падчас хаджэньняў у народ. Тым ня менш, выявілася, што папулярнасьць ды зухаваты выгляд ці лётчыцкае майстэрства яшчэ не даюць гарантыяў недатыкальнасьці, тым болей калі перад законам усе маюць роўныя правы ды абавязкі. Зьвядзеньне рахункаў, расправа з маладым таленавітым палітыкам, які не ўпісаўся ў палітычны бамонд, — гэта ўсё са сфэры эмоцыяў. Насамрэч, актуальнымі заставаліся два пытаньні: ці парушыў прэзыдэнт Канстытуцыю і ці адбывалася працэдура імпічмэнту ў адпаведнасьці з законам. І тут ніякія мінулыя заслугі, ніякія фігуры вышэйшага пілятажу Паксасу дапамагчы ўжо не маглі.

І яшчэ. Стала ясна, што прэзыдэнт, як ніхто іншы, мусіць быць асьцярожным у выбары сяброў і знаёмых. Нездарма кажуць: скажы мне, хто твой сябра, і я скажу табе, хто ты.

Што з гэтага вынікае для Беларусі? Адстаўка адбылася ў зусім іншай краіне — ва ўсіх сэнсах гэтага слова. Ці можна ўявіць сабе такое сёньня, скажам, у суседняй Расеі? Нонсэнс! Імпічмэнт зрабіў яшчэ больш выразнай рысу, якая аддзяляе цяпер краіны NATO ад краінаў, што застаюцца на ўсходзе ад блёку. Беларусь магла быць сярод першых на шляху да дэмакратыі. Цяпер ёй трэба паўтараць урокі для самых адсталых вучняў.

**Віталь Тарас**

# Царква пайшла па міністэрствах

## Адукацыя застанецца сьвецкай, але зьявіцца праваслаўнае радыё

**Цяпер у садках, школах, ВНУ Нараджэньне Хрыстова, Вялікдзень, Радаўніцу, Дзень маці «могуць» сьвяткаваць у адпаведнасьці з мэтадычнымі распрацоўкамі, зробленымі ў Праваслаўнай царкве. Апрача таго, Царкве дазволена разам з супрацоўнікамі міністэрства праводзіць экспэртызу праграмаў і падручнікаў па прадметах гуманітарнага цыклу. У школах і садках «могуць (з ініцыятывы бацькоў)» уводзіцца заняткі «праваслаўнага выхаваньня». Гэта прадугледжваецца праграмай супрацы, якую падпісалі міністар адукацыі і мітрапаліт Філарэт.**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Міністэрства запэўнівае, што адукацыя застанецца сьвецкай. «Усе мерапрыемствы па супрацы з Праваслаўнай царквой будуць весьціся як пазаклясная і пазашкольная работа», — цьвердзіць галоўны інспэктар Мінадукацыі Анатоль Кучынскі. Чыноўнік адмаўляе магчымасьць чытаньня ў школах Закону Божага.

Год таму ўжо зьяўляліся чуткі пра Закон Божы ў школах. Аднак тагачасны міністар адукацыі Пятро Брыгадзін заявіў: «Пакуль я кірую міністэрствам, адукацыя застанецца сьвецкай».

Беларускі экзархат РПЦ цэлы месяц выступаў у ролі «ньюсмэйкера». За сакавік былі падпісаныя пагадненьні й праграмы супрацы з Акадэміяй навук, міністэрствамі абароны, працы і сацыяльнай абароны, інфармацыі. Гэтак, Мініфармацыі, паводле дакумэнту, падбае пра стварэньне праваслаўнага радыёканалу. Акром таго, праваслаўныя запатэнтавалі на сябе ў Нацыянальным цэнтры інтэлектуальнай уласнасьці слова «праваслаўны» ды зарэгістравалі як знак калектыўнай уласнасьці крыж Эўфрасіньні Полацкай.

Супрацоўнік інфармацыйнага цэнтру «Свабода сумленьня» Станіслаў Акінчыц бачыць праблему не ў праваслаўі, а ў дзяржаве: «Праваслаўная царква не імкнецца манапалізаваць духоўнае жыцьцё краіны. Гэтае пагадненьне патрэбнае дзяржаве. Дзяржава выступіла ініцыятарам пагадненьня, значыць, ёй гэта для нечага трэба, існуе нейкі плян. Царкве дзяржаваю адводзіцца роля марыянэткі». С.Акінчыц лічыць, што дэкляраваная «пазашкольная праваслаўная праца» вельмі лёгка можа ператварыцца ў прымусовую: «Няма мэханізмаў, якія запабеглі б гэтаму. Як у БРСМ запісваюць пагалоўна ўсіх, так могуць і на праваслаўныя заняткі заганяць без разбору».

На думку С.Акінчыца, хваля дамоваў, што ідуць у фарватэры леташняга «Закону аб свабодзе сумленьня» ды канкардату паміж Праваслаўнай царквой і дзяржавай, тоіць найбольшую небясьпеку для саміх праваслаўных. Дзяржава робіць стаўку менавіта на Праваслаўную царкву. Аднак узамен за прывілеі ад Царквы запатрабуе поўнага падпарадкаваньня ўладзе.

**Аркадзь Шанскі**

## «Пагоня» чакае ў сховах

З узмацненьнем ідэалягічнай працы ў краіне працягваецца «ўкараненьне ў масы» сучаснай дзяржаўнай сымболікі. Плякаты з гербам і сьцягам, а таксама партрэты А.Лукашэнкі вешаюць ужо і ў яслях.

Тым часам зьнікаюць апошнія выявы «Пагоні» ў дзяржаўных установах. Самая вялікая, якая ўпрыгожвала некалі будынак Аршанскага гарвыканкаму, перавезеная ў музэйнае фондасховішча. На франтоне будынку раённага аддзелу адукацыі зноў красуецца бээсэсэраўскі герб. Каб не рабіць новай шыльды, у Аршанскім пэдагагічным каледжы выяву «Пагоні» зрэзалі, а на яе месца накляпалі новы-стары герб. Апошняй установай, на якой да нядаўняга часу вісела шыльда з «Пагоняй», была школа №8 на вуліцы Магілёўскай, па якой прэзыдэнт звычайна накіроўваецца на Шклоўшчыну. Дарэчы, у гэтай школе ў другой палове 50-х настаўнічаў Уладзімер Караткевіч, аб чым сьведчыць мэмарыяльная дошка.

Сапраўдную нацыянальную сымболіку яшчэ можна бачыць у асобных кабінэтах гісторыі ў школах ды тэхнікумах. Але, верыцца, надыдзе час, калі ўсё зьменіцца і сёньняшнюю псэўдасымболіку схаваюць у музэях (бо ж гісторыя). Але, відаць, хопіць макулятуры і бамжам.

## Які гаспадар, такі й сабака

Колькі б ні прымалі аршанскія ўлады рашэньняў аб належным утрыманьні сабакаў, яны па-ранейшаму парушаюцца. Амаль штомесяц па антырабічную дапамогу (прышчэпкі супраць шаленства) у бальніцы зьвяртаюцца па дваццаць і больш месьцічаў, сярод іх дзеці, асобных даводзіцца шпіталізаваць. Хто вінаваты — злы сабака ці ягоны гаспадар — вырашае адміністрацыйная камісія гарвыканкаму.

Згодна з артыкулам 103 Адміністрацыйнага кодэксу, за парушэньне правілаў утрыманьня сабакаў, якія нанесьлі страту здароўю або маёмасьці грамадзян, гаспадар караецца штрафам да дзесяці базавых велічыняў (б.в. складае цяпер 19 тыс. руб.). Акрамя таго, пасьля рашэньня адміністрацыйнай камісіі пацярпелы бок мае права зьвярнуцца ў суд дзеля пакрыцьця як маральных, так і матэрыяльных стратаў. Звычайна такія працэсы пацярпелыя выйграюць. Бывалі выпадкі, калі адказчыкі выплачвалі па 500—700 даляраў.

Як правіла, гаспадары кусачых сабакаў — бультэр'ераў, ратвэйлераў, мастыфаў — людзі нябедныя. І праблема тут ня столькі ў злосных нявыхаваных сабаках, колькі ў іхных гаспадарах. Нейкі грамадзянін Валадкевіч, які трымае нямецкую аўчарку, выклікаўся на адміністрацыйную камісію ажно сем разоў!

У заключэньне хочацца «рэабілітаваць» (пасьмяротна) ратвэйлера з Аршанскага раёну, якога падазравалі ў забойстве сваёй састарэлай гаспадыні (аб чым паведамляла «НН» летась). Пасьля сьледчай экспэртызы высьветлілася, што сабака ня быў шалёны. Дарэчы, выпадкі, калі ратвэйлеры забівалі сваіх гаспадароў, нярэдкія. Кінолягі тлумачаць гэта асаблівасьцямі псыхікі сабакаў гэтае пароды. Так што пры сустрэчы зь імі сьцеражыцеся.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

## Полацак узьбіўся на цыгарэтны бізнэс

У Полацку адкрылася трэцяе ў Беларусі тытунёвае прадпрыемства — беларуска-багамска-расейскае СП «Белпрота». Пачаць працаваць палачане былі гатовыя яшчэ летась, але доўгі час ім не выдзялялі квоты на выраб тытунёвае прадукцыі. Праблемы вырашыліся, старшыня гарвыканкаму Уладзімер Тачыла перарэзаў чырвоную стужку. Пакуль што прадпрыемства будзе працаваць у адну зьмену і вырабляць адзін гатунак цыгарэт «ВР», блізкі па якасьці да «L&M». У праектах — яшчэ 15 гатункаў. Працуе на прадпрыемстве 30 чалавек. Усё абсталяваньне — замежнай вытворчасьці.

**Васіль Кроква, Полацак**

## Возера Белае жыве па сваіх законах

З 1 красавіка да 30 траўня абмежаваная лоўля рыбы. Забароненая прамысловая лоўля, а аматарская дазваляецца толькі на адну вуду з адным кручком ці сьпінінг і ў вызначаных месцах, ня там, дзе рыба нерастуе. Гэтак робіцца штогод, аднак сёлета ёсьць колькі асаблівасьцяў.

Жыхарам тых месцаў Навагрудчыны і Вялейшчыны, якія адарваныя ад буйных населеных пунктаў паводкай, сёлета дазволена выкарыстоўваць маторныя лодкі для лоўлі рыбы, хоць увогуле маторкі забароненыя.

А вось палешукам з-над возера Белага ў Драгічынскім раёне прыйдзецца ўстрымлівацца ажно да 9 чэрвеня. Гэта зроблена па просьбе Ўкраіны, на памежжы зь якой разьмешчана возера. «Пачалі мы забарону па нашых тэрмінах, а скончым па ўкраінскіх», — кажуць у Міністэрстве.

Аднак і на адзін сьпінінг добры рыбак сям'ю пракорміць. Пінчук Анатоль Багатка праславіў сябе, выцягнуўшы зь Піны 5 красавіка шчупака даўжынёй 120 см і вагою 12 кг. Рыба, што нядаўна аднераставала, ня дужа супраціўлялася. І гэта яшчэ ня рыба проці 50-кілаграмовага сама, якога шчасьліўчык Багатка выцягнуў на Прыпяці два тыдні таму. Даўжыня ягонае 180 сантымэтраў!

**Сяргей Трафілаў; БелаПАН**

## Вынікі баранавіцкага конкурсу

Баранавіцкая арганізацыя партыі БНФ абвесьціла вынікі конкурсу, прысьвечанага 86-й гадавіне БНР. Першае месца заняла Ганна Кучура, студэнтка Эканоміка-юрыдычнага тэхнікуму. Яна атрымала галоўную ўзнагароду — CD-плэер. Наймаладзейшым удзельнікам конкурсу аказаўся 12-гадовы Раман Латушка зь Менску.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

# Экумэнізм — яшчэ не яднаньне



У 1910 г. у Эдынбургу (Шатляндыя) пачаўся рух, які атрымаў назву экумэнізм. Слова «экумэнізм» паходзіць з грэцкага «экумэна», або «айкумэна» — людзі, што насяляюць зямлю. Ідэя была ў аднаўленьні адзінства ўсіх хрысьціянскіх Цэркваў з захаваньнем адметнасьцяў, што існуюць у кожнай зь іх. Не зьяднаньне ўсіх рэлігій у адну, а суіснаваньне розных самастойных канфэсій і абрадаў, якія займелі б адзіны орган кіраваньня.

Шматлікія цэрквы лічаць менавіта сябе сапраўднымі вучнямі Ісуса Хрыста і наступнікамі створанай Ім Царквы. Экумэнізм быў спробай новага падыходу: каб кожная супольнасьць не лічыла сябе адной-адзінай сапраўднай Царквой Хрыстовай, а прызнавала частку «царкоўнасьці» ў іншых. Каб гаворка не ішла аб далучэньні асобных адпалых хрысьціян да «правільнае» Царквы. А аб прызнаньні, што ўсе Цэрквы роўныя. Гэта патрабуе пакаяньня, прызнаньня сваіх грахоў, жаданьня адмовіцца ад «вузкіх» ці застарэлых элемэнтаў свайго веравучэньня.

У часы першай сусьветнай вайны ўзьнік рух «Жыцьцё і дзейнасьць», заснавальнікам якога быў арцыбіскуп Упсалы Натан Сэдэрблом, а таксама Сусьветны зьвяз для спрыяньня міжнароднаму сяброўству пры супрацоўніцтве Цэркваў, заснавальнікамі якога былі нямецкі багаслоў Фрыдрых Зыгмунд-Шульцэ і біскуп Дацкае царквы Вальдэмар Амундсэн.

Тры экумэнічныя рухі ўтварылі ў траўні 1938 г. Папярэдні камітэт Сусьветнай рады Цэркваў, аднак праз другую сусьветную вайну камітэт ня дзейнічаў.

Толькі ў 1948 г. была афіцыйна абвешчана Сусьветная рада Цэркваў, якая з часам аб'яднала ў сваіх шэрагах трыста пратэстанцкіх дэнамінацый і памесныя праваслаўныя Цэрквы.

Каталіцкі Касьцёл сёньня актыўна выступае за дыялёг хрысьціян на прынцыпах экумэнізму, у адрозьненьне ад Праваслаўнае царквы. Апошняя бярэ ўдзел у Сусьветнай радзе Цэркваў, але да самой ідэі экумэнізму ставіцца скептычна, бо бачыць у ёй пагрозу сваёй традыцыі. Аднак так было не заўжды.

Доўгі час насьцярожана ставіліся да экумэнізму якраз каталікі. Яны лічылі менавіта сябе адзінымі наступнікамі сапраўднай Царквы. У 1928 г. Папа Пій XI забараніў каталікам удзельнічаць у «панхрысьціянскім руху». Толькі пасьля II Ватыканскага Сабору пазыцыя Касьцёлу зьмякчылася і Рымскі Пасад пагадзіўся, што і іншыя Цэрквы маюць ісьціну. Знакаміты дэкрэт «Unitatis redintegratio» ўпершыню згадаў «Цэрквы-сёстры».

Адным з самых важных вынікаў экумэнічных кантактаў стаўся акт аб скасаваньні ўзаемных праклёнаў 1054 г. Аднак трэба прызнаць, што фундамэнталісты ў шэрагах Цэркваў і Касьцёлу па-ранейшаму лічаць свае супольнасьці адзінымі носьбітамі праўды, а іншых — «схізматыкамі» або «рымскімі ератыкамі».

Расейская праваслаўная царква ўвайшла ў склад СРЦ у 1961 г. Касьцёл дагэтуль не ўвайшоў у Сусьветную раду Цэркваў, аднак усяляк падтрымлівае дзейнасьць СРЦ і дасылае сваіх назіральнікаў на ўсе паседжаньні Рады.

У чым канкрэтна праяўляецца экумэнізм? Найбольш у багаслоўскіх, культурных і бюракратычных кантактах. У Беларусі, напрыклад, Праваслаўная царква й Касьцёл супольна ладзяць выставы іканапісу, музычны фэстываль «Магутны Божа». Але ў Беларусі пратэстанты застаюцца ўбаку ад гэтага. Баптысты, пяцідзясятнікі і прадстаўнікі іншых супольнасьцяў збольшага кантактуюць між сабой. А праваслаўныя сьвятары «на месцах» часта вядуць актыўную прапаганду супраць «сэктантаў».

**МБ**

# Грэка-каталік пра адзінства

**Чаму рыма-каталікі ня надта імкнуцца да супрацоўніцтва з грэка-каталікамі? Якая будучыня чакае ўніяцкую канфэсію ў Беларусі? Ці магла б Беларусь стаць узорам для экумэнічнага дыялёгу паміж рэлігіямі? Ці зьмянілася б штосьці ў нашым краі ад візыту Папы? Адказвае настаяцель грэка-каталіцкага манастыра ў Полацку айцец Лявонці Тумоўскі.**



**«НН»: Праваслаўныя і каталікі жывуць па розных календарах. У нас суседзі па два разы сьвяткуюць Каляды і Вялікдзень. Гэта падрывае калі не веру, дык абраднасьць. Чалавек кажа: «Хрыстос жа ня два разы ўваскрос. Значыць, гэта сьвятары ўнечым несумленныя. І я да іх не пайду».**

**Айцец Лявонці:** Калі гаворка йдзе пра непаразуменьне між каталікамі й праваслаўнымі, называюцца розныя прычыны багаслоўскага характару. Але рэальна яны ня ёсьць прычынаю падзелу. Калі распачаць багаслоўскі дыялёг, гэтыя пытаньні можна было б зьняць. Цэрквы існуюць больш за тысячу гадоў у стане падзелу, і за гэты час утварылася традыцыя існаваньня паасобку. Цэрквы існуюць як самадастатковыя сыстэмы, што не патрабуюць адна другой. Справа ў традыцыі...

**«НН»: Хіба традыцыі хрысьціянства ў Беларусі ня лучаць тутэйшых каталікоў з тутэйшымі праваслаўнымі мацней, чым з каталікамі дзе ў Камэруне?**

**Л.Т.:** Галоўны элемэнт, які мусіў бы нас лучыць, гэта элемэнт нацыянальны. Але якраз ён стаўся падставаю канфэсійнага падзелу. Вядома: каталікі — палякі, праваслаўныя — расейцы і г.д… І гэты стэрэатып не дае паглядзець на нацыянальны чыньнік як на супольны для каталікоў і праваслаўных.

**«НН»: Як Вам асабіста бачыцца пэрспэктыва экумэнічнага дыялёгу надалей? У якіх формах?**

**Л.Т.:** Нармальным станам і для каталікоў, і для праваслаўных быў бы стан царкоўнае еднасьці. Каляндарнае супадзеньне сьвяткаваньня Вялікадня яшчэ раз гэта пацьвярджае. Але, пакуль дзейнасьць Царквы і Касьцёлу ня выйдзе за межы царкоўнага «паркінгу», пакуль іх дзейнасьць будзе абмяжоўваца толькі тымі людзьмі, што ходзяць да царквы альбо касьцёлу, пра дыялёг сур'ёзную гаворку весьці немагчыма. Толькі калі Царква і Касьцёл выйдуць па-за свае лякальныя межы, можна думаць пра дыялёг. Толькі ў працы місіянэрскай ці сацыяльнай гэтыя цэрквы могуць сустрэцца. І такое працы Беларусь патрабуе шмат.

> Завялікі ўплыў суседзяў на беларускія канфэсіі замінае Беларусі стаць цэнтрам сустрэчы царкоўных традыцыяў.

**«НН»: Чаму рыма-каталікі ня надта імкнуцца да супрацоўніцтва з грэка-каталікамі ў Беларусі?**

**Л.Т.:** Яны нас не заўважаюць. Гэта агульная праблема для беларускага грамадзтва — абыякавасьць. Абыякавасьць да праблемаў іншых людзей. Пагатоў іншых канфэсіяў. Цікавасьць грунтуецца адно на інтарэсах, зь якіх можна скарыстаца. Грэка-каталіцкая царква ня мае такога ўплыву на грамадзтва, каб ёю цікавілася дзяржава, а нават і браты рыма-каталікі. Нават пры наяўнасьці прыязных асабістых стасункаў, афіцыйныя кантакты ня ёсьць тут каштоўнымі. Мы ім ня маем чым дапамагчы. Гэта рэчаіснасьць. Самі патрабуем дапамогі.

**«НН»: Якой Вам бачыцца будучыня Вашае ўніяцкае канфэсіі ў Беларусі?**

**Л.Т.:** Беларусь будзе поліканфэсійнай дзяржаваю. Адназначна. Тое месца, якое зойме Грэка-каталіцкая царква, будзе залежаць ад таго, як яна сама будзе разьвівацца ў сваёй супольнасьці. Усё залежыць ад нас.

**«НН»: Ці зьмянілася б штосьці ў нашым краі ад візыту Папы?**

**Л.Т.:** Перадусім мусілі б у нашай краіне адбыцца пэўныя зьмены. Між іншым, і ў стаўленьні да Грэка-каталіцкае царквы. Толькі ў выніку зьменаў ладу мог бы стаць рэальным і візыт Папы.

**«НН»: Ці магла б Беларусь стаць узорам для экумэнічнага дыялёгу паміж рэлігіямі, паміж царкоўнымі Захадам і Ўсходам?..**

**Л.Т.:** Безумоўна! Мы маем менавіта ў Беларусі прэцэдэнт Берасьцейскае уніі. Але перадусім сама Беларусь мае мець уплыў. Дарэчы, і на ўнутрырэлігійную сытуацыю таксама. Пакуль мы бачым адно вялікі ўплыў суседзяў на нашыя канфэсіі. І, выглядае, менавіта ён замінае таму, каб Беларусь наноў сталася цэнтрам сустрэчы гэтых традыцыяў.

**«НН»: Ян Павал II у сваёй энцыкліцы «Fides et ratio» адзначыў, што «ў гісторыі Ўсходу, як і ў гісторыі Захаду, можна заўважыць, што чалавек на працягу стагодзьдзяў прайшоў пэўны шлях, што вёў да сустрэчы з праўдаю й да сутыкненьня з ёю». Калі мы, хрысьціяне, спаткаліся з праўдаю ў Пасхальнай Таямніцы, чаму няма між намі згоды?**

**Л.Т.:** Дарога да тае праўды нам адкрытая. Шлях хрысьціянскага жыцьця — радыкальны. І дзеля таго, каб стаць на яго, трэба адмовіцца ад іншых. У сучасным сьвеце, каб дамагчыся посьпеху, трэба шмат якімі рэчамі ахвяраваць. Таму сёньня хрысьціяне, у большыні сваёй, лічаць, што яны няздольныя да ахвяраў у сваім духоўным жыцьці.

**Гутарыў Сяргей Харэўскі**

# Філарэт і Сьвёнтак сказалі: «Рана»

**Ад 1054 году каталікі й праваслаўныя моляцца паасобку. Ізноў зьяднаць іх пад адным дахам надумаў смалявіцкі фэрмэр Зьміцер Козыр. І вось што з гэтага выйшла.**

Зьмітра Козыра добра ведаюць у Смалявічах. Ня толькі таму, што ён ачольвае фэрмэрскую гаспадарку «Забалоцьце», гадуе коні. Спадар Козыр — старшыня смалявіцкага касьцельнага камітэту пры храме Сьв.Валянціна.

Хрышчаны ён быў у дзяцінстве ў праваслаўе, як і ягоныя бацькі. За савецкім часам быў шчырым камуністам-атэістам, а ў 90-я перагледзеў свае пазыцыі й прыняў каталіцтва. Кажа, не без дапамогі старэйшай дачкі Насты. Яна першая ў сям'і самастойна абрала сабе веру. Тады сям'я Козыраў жыла ў Менску, і дачка штораніцу перад вучобай хадзіла на службу ў Залатагорскі касьцёл да айца Міхала Сапеля — адукаванага і цікавага чалавека, які зачароўваў моладзь сваімі словамі. Зь ягонай дапамогай пайшоў да касьцёлу і сп.Зьміцер.

У а.Міхала былы намесьнік старшыні смалявіцкага калгасу пабраўся шлюбам з Тацянай Працькай — цяпер старшынёй Хельсынскага камітэту, у яго ж хрысьціў дзяцей. Нават унука, што нарадзіўся ў Амэрыцы, прывезьлі ў Менск да айца Міхала.

Паступова сп.Козыр разгарнуў сваю гаспадарку, але рэлігія на другі плян не адышла. У 1996 г. ён зарэгістраваў у Менскім аблвыканкаме рыма-каталіцкую парафію і задумаў адрадзіць у Смалявічах храм. Супольны — хрысьціянскі. І для каталікоў, і для праваслаўных.

У Смалявічах не было парафіі з 1935 г. — і царкву, і касьцёл разбурылі бальшавікі. У 16-тысячным горадзе каля дзьвюх тысяч каталікоў (зь іх блізу 200 — актыўных, тых, хто рэгулярна прыходзіць на набажэнствы).

Сп.Козыр лічыць, што і праваслаўныя, і каталікі існуюць у краіне нібы ў сымбіёзе, падзяліць іх немагчыма. Тое пацьвярджаюць хоць бы падвойныя крыжы з супольнай перакладзінай — «бы за рукі ўзяліся», — якія сустракаюцца па дарозе на Горадню, ля Маладэчна ды ў іншых месцах.

Вось і зьвярнуўся сп.Козыр адначасова да ўладыкі Філарэта і кардынала Сьвёнтака з прапановай — пабудаваць адзін храм, дзе б маглі правіць набажэнствы і праваслаўныя, і каталікі. І зь першым, і з другім фэрмэр-старата быў асабіста знаёмы — неаднойчы сустракаліся на рознага кшталту прыёмах.

Аднойчы ўладыка і кардынал разам прыяжджалі ў Смалявічы, нават адначасова пераhрысьцілі прыхаджанаў. «Вось не было тады ў мяне фатакамэры!» — шкадуе сп.Зьміцер. Мітрапаліт ідэю Козыра пра супольны храм ухваліў, але сказаў, што час яшчэ не прысьпеў на тое. Кардынал таксама не супярэчыў, але зноў жа параіў не апярэджваць ходу падзей...

Цяпер у Смалявічах побач будуюцца два храмы. На праваслаўным ужо ўзьвялі дах і паставілі крыж — трэба думаць, на Вялікдзень дзьверы яго адчыняцца. Смалявіцкія каталікі спадзяюцца ўвайсьці ў свой храм на Каляды. На Вялікдзень, як і ўсе апошнія гады, будуць маліцца ў невялічкім вагончыку на 40—45 чалавек. Але гэта не абуджае зайздрасьці да суседзяў-праваслаўных. У мінулыя гады каталікі нават прыбіралі вуліцу, калі ў праваслаўных было сьвята, і наадварот. «А сёлета Вялікдзень будзем сьвяткаваць усе разам», — па-добраму ўсьміхаецца спадар Зьміцер.

**Сяргей Будкін**




**Зьміцер Козыр дабраўся і да мітрапаліта, і да кардынала.**

# Жыцьцё між царквой і касьцёлам

**Машчонае было напалову каталіцкім, напалову праваслаўным. Помню, як нашыя праваслаўныя суседзі Безьмяны пачыналі секчы дровы ў каталіцкія сьвяты. Грукат стаяў дай божа, і наш бацька вельмі злаваў: «Ізноў гэтыя кацапы, каб іх!» Аднак Ганна Сайкоўская атрымала іншы жыцьцёвы арыенцір.**



**Вялікая сям'я Ганны (маці) і Ўладзімера Сайкоўскіх (1950-я).**

Мая бабуля Ганна з таго перадваеннага пакаленьня беларусаў, што засьпелі сталінскія рэпрэсіі й фашыстоўскую навалу, адбудоўвалі зруйнаваную гаспадарку і канчаткова зьехалі зь вёскі ў горад. За гэтыя сем дзесяцігодзьдзяў шмат гора яны пабачылі, акіян сьлёз пралілі. Многія зь іх так і не дачакаліся незалежнасьці, іншым гэта незалежнасьць сталася сольлю ўвачу. Доўгія стагодзьдзі іх продкаў падзяляла непарушная сьцяна веравызнаньня: каталік есьць палякам, праваслаўны — расейцам. Беларусам у гэтай сыстэме месца не было. У мадэрнізаваным выглядзе існуе гэтая перашкода й сёньня. Але ці ёсьць яна натуральнай на нашай зямлі? Адказ на гэтае пытаньне я паспрабаваў знайсьці ў расповедзе саваёй бабулі.

«Я нарадзілася пры канцы сьнежня 1930 г. (запісалі — 1 студзеня 1931-га) у вёсцы Машчонае, што на Койданаўшчыне. Бацькі мае — Ганна Емяльянаўна і Ўладзімер Браніслававіч — абое былі каталікамі, але прыкметна розьніліся сваім сацыяльным становішчам. Маці паходзіла з цалкам каталіцкай вёскі Рудзіцы з заможнай шляхецкай сям'і Шчаблоўскіх. Бог падараваў яе бацькам шэсьць сыноў і дзьвюх дачок, таму праблемаў зь вядзеньнем гаспадаркі ў Шчаблоўскіх не было. Жылі багата, бо многа працавалі. Мелі найлепшую ў вёсцы хату, дарагі замежны патэфон, каштоўны фарфоравы сэрвіз і шмат іншых рэчаў, якія для іншых вяскоўцаў былі сапраўдным дзівам.

Маці распавядала, што ў маладосьці ёй вельмі ўпадабаўся хлопец з суседняй праваслаўнай вёскі. Але прысуд ганарлівых братоў быў няўмольным: «За кацапа ня пойдзеш! Шукай сабе нармальнага чалавека, каталіка». У выніку Ганна Емяльянаўна выйшла замуж толькі ў 27 гадоў за зьбяднелага селяніна Ўладзімера Сайкоўскага з Машчонага. Ягоны брат Ясь, набраўшы пазыкаў, зьехаў за акіян. Сувязь зь ім згубілася назаўсёды. Жылі маладыя ня вельмі ладна. Хутка пасьля нараджэньня памерла першае дзіця. Бацька часта ўпікаў маці за яе шляхецкасьць. Асабліва нэрваваўся, калі да жонкі наведваліся браты — заўжды на брычцы, у модных строях з інтэлігенцкімі кіёчкамі. «Вунь зноўку твае панкі прыехалі», — паўтараў ён.

Мамін бацька Емяльян, мой дзед, і ягоны халасты брат усё жыцьцё дзялілі адну хату і цягам доўгіх гадоў зьбіралі грошы на дадатковы надзел. Усё ж на шэсьць сыноў зямелькі не хапала. Але назапашаныя з такой цяжкасьцю грошы ім не спатрэбіліся. Бацька памёр, пасьля — ягоны брат, а іх скарб захапілі бальшавікі.

Дакладна ня памятаю даты, было мне тады ўсяго некалькі гадоў, як і ў нашай вёсцы Машчонае пачаліся чысткі. Адной ноччу «чорны варанок» забраў сем мужыкоў. Усе яны зьніклі назаўжды. Сярод людзей запанаваў жах. З нашай хаты бальшавікі выцягнулі ўсё больш-менш каштоўнае: дарагое матчына футравае паліто, той самы патэфон, фарфоравы сэрвіз...

Заможных Шчаблоўскіх абвесьцілі «кулакамі». Найлепшую ў Рудзіцах хату забралі пад калгасную кантору. Шэсьць сыноў і маці сталіся «ворагамі народу». Юзік яшчэ ў турме захварэў на сухоты і хутка памёр. Франак і Віталь бясьсьледна згубіліся дзесьці за аршанскімі кратамі. Вінцэся вызвалілі, але ён, на сваю бяду, пайшоў у органы праўды шукаць. Болей яго ня бачылі. Янку і Волеся разам з старэнькай маці Сабінай, маёй бабуляй, адправілі па этапах на Алтай. Там, аднак, вольналюбівыя хлопцы надоўга не забавіліся і разам з маткай уцяклі дадому. Дабіраліся доўгія месяцы. Рухаліся пешшу, плылі на чаўне — уначы. Днём хаваліся па лясах, кустах, сілкаваліся тым, што траплялася на шляху. Бог дапамог. Дайшлі.

Матулю браты завезьлі да сястры Мані ў вёску Магалеўшчына, што за два з паловай кілямэтры ад Станькава. У саміх застацца на роднай зямлі шанцаў не было — Янка і Волесь перайшлі савецка-польскую мяжу й эмігравалі ў Ангельшчыну. У часе другой сусьветнай вайны і па ёй мая матуля атрымала ад іх два лісты і фатакартку. З пажоўклага здымку браты вясёла паглядалі зь дзівосным зьвязкам бананаў у руках. Напісалі адказ, які да іх, відаць, так і ня трапіў. Болей ад братоў вестак не было.

Машчонае было напалову каталіцкім, напалову праваслаўным. Помню, як нашыя праваслаўныя суседзі Безьмяны пачыналі секчы дровы ў каталіцкія сьвяты. Грукат стаяў дай божа, і наш бацька вельмі злаваў: «Ізноў гэтыя кацапы, каб іх!» Калі надыходзіла іх сьвята, мы, малыя, хацелі ў помсту рабіць тое самае. Дык матуля заўсёды настаўляла: «Ня трэба рабіць людзям благое, у іх сёньня сьвята Боскае».

У нашых мясьцінах было два касьцёлы. Часьцей за ўсё хадзілі за сем кілямэтраў у Койданава. Зрэдзьчас — у Рубяжэвічы. З пачаткам рэпрэсіяў прыгожы койданаўскі касьцёл аддалі пад склад. Пазьней ён некалькі разоў зачыняўся і зноўку адраджаўся.

У вайну каля самага касьцёлу вынішчалі мясцовых габрэяў. Вяскоўцы ўзгадвалі, што пасьля масавага расстрэлу зь ямы, якая толькі зьверху была прысыпаная зямлёй, у неба біў крывавы фантан. Па вайне ж каровы, дабрыўшы да гэтага месца, звар'яцела раўлі.

Калі касьцёл паблізу не працаваў, мы, каталіцкая дзятва, беглі на сьвяты ў царкву сьвянціць яйкі і заставаліся ў праваслаўным храме на ўсю ноч. Разумная мама казала: «Нічога кепскага ў гэтым няма. Як ні круці, а Бог у нас усіх адзіны». Гэтыя словы сталіся маім жыцьцёвым арыенцірам.

Аднойчы я прывяла ў хату бацькоў свайго каханага Яўгена Лашкевіча. Сам ён быў зь вёскі Пінюгі на Быхаўшчыне, але па вайне атабарыўся ў Менску і нярэдка наведваўся ў Машчонае да свайго дзядзькі, што жыў цераз дарогу ад нас.

— Хачу ўзяць вашую дачку ў жонкі, — зьвярнуўся Яўген да маіх бацькоў.

— Пачакай, — адказала маці. — Ты хто, праваслаўны?

— Так.

— Тады пра нашую дачку і ня думай. Вунь Стафан — каталік, добры хлопец. За яго і пойдзе.

Але ўсё гэта было ня болей чым іспыт. Ганна Емяльянаўна памятала сваю маладосьць і для сваёй дачкі жадала лепшага лёсу. Бацькі прынялі Лашкевіча. Хутка мы ажаніліся. Сваіх дзяцей хрысьцілі ў праваслаўе, заўсёды адзначалі абодва сьвяты, і ніякіх праблемаў на гэтай глебе ў нас ніколі не ўзьнікала».



**Яўген і Ганна пажаніліся, хоць і былі розных вызнаньняў.**

* * *

«Помніма, братцы, ці мы католікі, ці мы праваслаўныя, — мы беларусы, а Бацькаўшчына наша — Беларусь. Не мяшайма справы рэлігіі з нацыянальнасьцю», — 90 гадоў таму пісаў у «Нашай Ніве» Янка Купала.

Помніма, братцы! Са сьвятам вас, беларусы!

**Кастусь Лашкевіч.**

Фота з архіву аўтара

# «Візыт Папы ў Беларусь магчымы»

## Як толькі будзе іншы Папа

**У Беларусі рэпрэзэнтаванае найлепшае аблічча сучаснага каталіцтва. Аднак беларус-каталік у Расеі разглядаецца як «скрадзенае дзіця» ці «здраднік». Дыякан Андрэй Кураеў адказвае на пытаньні «НН».**

**«НН»: Праваслаўныя і каталікі жывуць па розных календарах. У нас у Беларусі сусездзі па два разы сьвяткуюць Каляды і Вялікдзень. Гэта падрывае калі ня веру, дык абраднасьць. Чалавек кажа: «Хрыстос жа ня два разы ўваскрос. Значыць, гэта сьвятары ў нечым несумленныя. І я да іх не пайду».**

**Андрэй Кураеў:** Такое бухценьне не пераконвае. Зусім ня гэта стрымлівае тых людзей ад паходаў у Царкву, а карысьлівасьць, асалода граху, зь якой ня хочацца развітвацца. Скажу пад сакрэтам, што хрысьціяне сьвяткуюць Вялікдзень увогуле штонядзелі, гэта значыць ня два, а 48 разоў на год!

**«НН»: А аб злучэньні календароў і Цэркваў Вы ня марыце?**

**А.К.:** Не, ня мару. Я не разумею, якім чынам можна ўзбагаціцца пры падобным злучэньні. Я не разумею, чаму я не магу папросту сябраваць з суседзкім рыма-каталіцкім сьвятаром, не пераходзячы пры гэтым у падпарадкаваньне да Папы. Апроч таго, сучаснае каталіцтва надта разнастайнае; ёсьць людзі, якія цягнуцца да праваслаўя, да старадаўніх вытокаў хрысьціянства, а ёсьць манахі, якія бяруць урокі мэдытацыі ў будыстаў…

У Беларусі рэпрэзэнтаванае найлепшае аблічча сучаснага каталіцтва. А на Захадзе больш мадэрнізму і «сьвецкасьці». Ніхто з каталікоў ня скажа, што ў жыцьці яго Царквы няма болевых месцаў. Дык адкуль жа тады ілюзія таго, што пры нашым злучэньні адбудзецца абмен толькі станоўчым? А можа, мы «болькамі» памяняемся?

Ведаеце, што больш за ўсё падабаецца расейскаму абывацелю ў каталіцтве? Тое, што ў каталікоў падчас службы можна сядзець. А што падабаецца заходняму абывацелю ў праваслаўі? Тое, што ў нас можна другі раз ажаніцца. Бо каталіцтва не прызнае другога шлюбу, а праваслаўе прызнае. І тысячы эўрапейцаў пераходзяць з каталіцтва ў праваслаўе зусім не таму, што яны пазнаёміліся з багаслоўем сьв.Рыгора Паламы, а дзеля апраўданьня другога шлюбу. Ёсьць і адна супольная хвароба ў праваслаўных і каталікоў. Гэта — сэкулярызацыя, празьмерная саступальнасьць ідэалягічным модам «гэтага веку». Менавіта таму, што ў нас саміх ёсьць гэтая нямоглаcьць, — мы мусім быць асабліва ўважлівымі да таго, каб яна не разрасталася далей. А каталіцтва традыцыйна палітызаванае і ў значна большай ступені сьвецкае… І, значыць, наша спагада да каталіцтва, наша злучэньне зь ім падштурхне аналягічны працэс і ў нас. Каб гэтага не было — лепей усё ж быць на адлегласьці.

**«НН»: Вы называеце беларускае каталіцтва адметным сваёй традыцыйнасьцю. Што для Вас самае выразнае і адметнае ў беларускім праваслаўі?**

**А.К.:** Я надта мала ведаю беларускае праваслаўе, каб заўважыць і сфармуляваць стылёвыя адрозьненьні. Мне толькі здаецца, што царкоўнае жыцьцё ў Беларусі сур’ёзна адстае ад царкоўнага жыцьця Расеі. У Беларусі адсутнічае ўласная багаслоўская літаратура, як і аўтарская царкоўная публіцыстыка. Я прыяжджаю ў Менск, шукаю кнігі мясцовых аўтараў, а іх няма, калі не лічыць твораў мітрапаліта Філарэта. Ёсьць толькі перавыданьні расейскіх ці францускіх аўтараў — падбор якіх, між іншым, дэманструе наяўнасьць добрага літаратурнага і багаслоўскага густу.

**«НН»: Як вы ацэньваеце пагадненьне паміж урадам і Беларускай праваслаўнай царквою, падпісанае летась?**

**А.К.:** У мяне такое ўражаньне, што гэта пагадненьне засталося на паперы. У мяне ёсьць свае крытэры для ацэнкі супрацоўніцтва дзяржавы і царквы: гэта перш за ўсё інфармацыйная палітыка і сфэра адукацыі. Колькасьць храмаў была дастасоўным крытэрам у канцы XIX ст., але не цяпер, у інфармацыйным грамадзтве. Ступень палітычнай і рэлігійнай свабоды можна вызначыць толькі паводле доступу да інфармацыйных каналаў. У прыватнасьці, па гатоўнасьці дзяржаўнай сыстэмы адукацыі супрацоўнічаць з царквою. Ёсьць асобныя школы і гарады, дзе сьвятароў пускаюць да дзяцей, але няма сыстэмы. У Расеі, прынамсі, першыя крокі ў гэтым кірунку Міністэрства адукацыі ўжо зрабіла: дазваляецца выкладаньне асноваў праваслаўнай культуры, выйшлі дзясяткі падручнікаў рознай пакуль якасьці.

Увогуле, першым значным крокам павінна стаць адкрыцьцё багаслоўскіх факультэтаў у пэдагагічных унівэрсытэтах і набор на іх з наступным больш-менш гарантаваным працаўладкаваньнем.

**«НН»: Як гэта магчыма ў беларускіх умовах, калі суіснуюць розныя канфэсіі?**

**А.К.:** Нішто не перашкодзіць суіснаваньню двух факультэтаў у адным унівэрсытэце. Частка курсаў будзе супольнай, частка — асобнай.

**«НН»: Візыт Папы ў Беларусь магчымы?**

**А.К.:** Як толькі будзе іншы Папа.

**«НН»: Візыт Яна Паўла ІІ немагчымы?**

**А.К.:** Магчымы, калі Ян Павал ІІ дасьць ясную сумленную ацэнку дзеяньням пагромнікаў на Заходняй Украіне, гвалту, які чынілі людзі, што называюцца грэка-каталікамі, уніятамі, перашкоды да візыту будуць зьнятыя. У нас могуць быць нармальныя стасункі з звычайнымі каталіцкімі сьвятарамі, але Папа нясе маральную адказнасьць за ўсё, што адбываецца ў папскай царкве, у тым ліку і за тое, што здарылася ва Ўкраіне на мяжы 80—90-х.

**«НН»: На Вашу думку, Папа прыедзе спачатку ў Беларусь ці ў Расію?**

**А.К.:** Гэта непрадказальна. Калі Папа ня знойдзе ў сабе моцы для таго сумленнага ўчынку, якога мы ад яго чакаем, то ягоны візыт будзе ўсяго толькі сьведчаньнем ступені несвабоды Праваслаўнай царквы ў той ці іншай дзяржаве. Бо менавіта дзяржава вымушае Праваслаўную царкву згадзіцца на візыт Папы. Так гэта было, напрыклад, у Баўгарыі, дзе ўрад шантажаваў Царкву, пагражаючы не прызнаць яе юрыдычнай асобай, каб прымусіць пагадзіцца на візыт. Калі ня будзе ціску, то пазыцыя Беларускай праваслаўнай царквы будзе супадаць з пазыцыяй Маскоўскага патрыярхату.

**«НН»: У адным расейскім часопісе я чытаў нараканьні на «польска-беларускі нацыяналізм» каталіцкіх сьвятароў у Расеі. Якія прэтэнзіі маюць праваслаўныя да расейскіх каталікоў?**

**А.К.:** Я бываў у многіх рэгіёнах, задаваў гэтае пытаньне, і ў адказ заўсёды падкрэсьлівалася нацыянальная прыналежнасьць сьвятароў. Там біскуп немец — праблемаў няма. Калі ж сьвятар ці біскуп паляк, канфлікты разгараюцца часьцей. Як пісала парыская газэта «Монд» яшчэ ў пачатку 80-х, «Ян Павал ІІ — перш за ўсё паляк, а Папа па сумяшчальніцтве». У ягонай палітыцы часам адчуваецца жаданьне ўзяць рэванш за паразу Рэчы Паспалітай у XVII ст. Менавіта польскія каталіцкія сьвятары ў Расеі спрабуюць вывесьці каталіцтва за рамкі нацыянальных грамадаў і зьвярнуцца да расейскіх дзяцей.

**«НН»: Яны гавораць, што прапаведуюць нявернікам, а не праваслаўным…**

**А.К.:** Крытэры праваслаўнасьці, як і крытэры прыналежнасьці да каталіцтва, могуць быць зусім рознымі. У літургічным, містычным пляне для праваслаўнай Царквы любы чалавек, які хрышчаны ў ёй, належыць да яе. Мы за гэтага чалавека молімся, хоць ён пра гэта можа і ня ведаць і нават не прасіць. Асабліва гэта заўважна ў падлетках. Ён можа жыць абсалютна міма-царкоўным жыцьцём. Але калі ў ягоны горад прыяжджае рок-гурт «Аліса» і на канцэрце Канстанцін Кінчаў сьпявае «Мы — праваслаўныя!», «генная» памяць абуджаецца ў гэтым падлетку і ён адказвае — «Так!». Калі ж яго рэлігійная падсьвядомасьць будзе абуджана казаньнем пратэстанта ці каталіка, яго самаспазнаньне ў якасьці праваслаўнага стане значна больш аддаленым і ўскладненым.

**«НН»: Каталікі ў апошні час робяць стаўку на беларускіх ксяндзоў для працы ў Расеі й забіраюць і лепшых, і горшых (арцыбіскуп Кандрусевіч, біскуп Клімовіч і дзясяткі маладых). У Беларусі гэта часта крытыкуецца: беларускія ксяндзы выяжджаюць у Расею, а на іх месца заступаюць палякі. Тым ня менш, стратэгія Касьцёлу застаецца нязьменнай. Вы ня раз паўтаралі, што Польшча — самы горшы з магчымых пасярэднікаў у дыялёгу Расеі з Захадам. А Беларусь? Ці, па-Вашаму, Беларусь — усё ж частка «ўнутранага расейскага сьвету»?**

**А.К.:** Беларускіх юнакоў забіраюць у беларускія каталіцкія сэмінарыі ня толькі для экспарту ў Расею, але і для адпраўкі ў Заходнюю Эўропу. Занадта вялікі «крызыс пакліканьня», вельмі мала маладых людзей хочуць зьвязваць сябе з абяцаньнямі цэлібату ў традыцыйна каталіцкіх краінах. І таму стаўка робіцца на асваеньне духоўных рэсурсаў усходнеэўрапейскіх народаў. Беларусы як прапаведнікі каталіцтва ў Расеі? Вы маеце рацыю, у Расеі Беларусь успрымаецца як частка «нашай» гістарычнай і культурнай прасторы. Таму беларус-каталік у Расеі будзе разглядацца як «скрадзенае дзіця» ці нават «здраднік». З гэтай прычыны ксёндз-француз ці італьянец выклікалі б большую сымпатыю.

**Гутарыў Мікола Бугай**




**Дыякан Андрэй Кураеў (1963) — праваслаўны інтэлектуал. Прафэсар Сьвята-Ціханаўскага праваслаўнага багаслоўскага інстытуту, старшы навуковы супрацоўнік катэдры філязофіі рэлігіі і рэлігіязнаўства філязофскага факультэту МДУ. Скончыў МДУ па катэдры навуковага атэізму (1984), пасьля чаго ахрысьціўся і перайшоў на працу ў Духоўную акадэмію (1985). Вучыўся ў багаслоўскім інстытуце ў Бухарэсьце. Працаваў рэфэрэнтам патрыярха Аляксія ІІ (1990—1993), дэканам філязофска-багаслоўскага факультэту Расейскага праваслаўнага ўнівэрсытэту Сьв. Яна Багаслова (1993—1996). Дыякан храму Сьв. Яна Хрысьціцеля на Прэсьні.**

## Глядзець ці не глядзець?

# «Пакуты Хрыстовы»

**Мэл Гібсан, амэрыканская кіназорка №1, уладальнік пяці «Оскараў», бацька сямёх дзяцей, шчыры каталік, зрабіў фільм, які адны называюць «антысэміцкім», другія — «занадта жорсткім» і «натуралістычным», а трэція папросту захапляюцца ўбачаным. У рэдакцыі «НН» адбыўся прагляд фільму.**


WWW.MOVIEWEB.COM

На здымкі «Пакутаў Хрыстовых» рэжысэр выдаткаваў уласныя 25 млн даляраў. Фільм быў выраблены на заснаванай ім жа студыі «Icon Productions» (ад слова «icon» — «абраз»). Прэм’ера была прымеркаваная да пачатку Вялікага Посту і адбылася 25 лютага ў Папялцовую сераду. Толькі за першы дзень пракату фільм сабраў 20 млн даляраў. «Пакуты» ў ЗША і Канадзе ўжо сабралі каля 300 млн даляраў, паглядзелі іх каля 30 млн чалавек. У Польшчы, як чакаецца, яны зьбяруць да трох мільёнаў гледачоў. Гэта ўдвая меней, чым апошняя вэрсія «Агнём і мячом», але — посьпех шалёны.

Не апошнюю ролю ў прамоцыі адыграла фраза «вось так усё й было», нібыта прамоўленая Папам пасьля прагляду. Яе растыражавалі СМІ, пакуль Ватыкан пасьпеў даць абвяржэньне. Папа не камэнтуе фільмаў, якія глядзіць.

І ўсё ж прыватную аўдыенцыю выканаўцу ролі Хрыста Ян Павал II даў, а Прэфэкт Кангрэгацыі ў справах духавенства кардынал Ояс параіў кожнаму каталіцкаму сьвятару паглядзець фільм Гібсана.

Стужка паказвае апошнія 12 гадзінаў зямнога жыцьця Ісуса. Дванаццаць гадзінаў ад Гефсіманіі да Кальварыі. Хрыста сыграў амэрыканец Джым Кевізэл, якому на момант пачатку здымкаў якраз споўнілася 33 гады. Румына-вугорская габрэйка Мая Моргенштэрн ствarae амаль іканапісны эвангельскі вобраз Маці Божай. Марыя Магдалена — франка-італьянская сэкс-дыва Моніка Бэлючы. Апостал Ян — баўгарын Хрыста Жыўкаў. Шатана-спакушальніка сыграла дачка Адрыяна Чэлентана Разалінда. Цікава раскрыты вобраз Юды: ягоная безабароннасьць перад малымі дзецьмі пасьля здрады, чарвівы труп вярблюда, вяроўка, сук…

Яшчэ да паказу кінастужку пачалі крытыкаваць. Сюжэт вымагаў ставіцца да карціны з большай увагай, чым да «проста кіно». Прадстаўнікі ўплывовых габрэйскіх арганізацый Антыдыфамацыйнай лігі (якая пільнуе антысэмітызм у СМІ) і Цэнтру Сымона Візэнтала, узброіўшыся чарнавікам сцэнару, даводзілі, што, паводле фільму, «адзіныя вінаватыя ва ўкрыжаваньні Хрыста» — юдэі. А таму стужка можа выклікаць хвалю антысэмітызму.

Рэжысэр пайшоў насустрач і «зьмякчыў» сцэнар: выкінуў словы «Кроў Ягоная на нас і на дзецях нашых»; зьмясьціў сярод натоўпу, што крычыць «Распні яго!», пару чалавек, якія патрабуюць Ісуса адпусьціць. Дый такая дэталька: рукі ў кадры, якія прыбіваюць Хрыста да крыжа, належаць Мэлу Гібсану. Другому абвінавачаньню — што прагляд фільму можа «зрабіць хісткай веру юдэяў», як заявіў Артадаксальны зьвяз амэрыканскіх габрэяў, — рэжысэр ня меў чаго процістравіць. Наадварот, імкнуўся зрабіць фільм максымальна пераканаўчым. Стужку можна назваць візуалізацыяй кананічнага Эвангельля і рэканструкцыяй падзеяў 2000-гадовай даўніны. Героі размаўляюць толькі на лаціне і па-арамейску. Адно што «натура» не біблійная — здымалі ў гарадах Матэра і Крака ў Італіі.

Максымальна натуралізаваныя і самі пакуты. На думку кінааналітыка Максіма Жбанкова, удзельніка прагляду ў рэдакцыі «НН», гэта зроблена для таго, каб «дагрукацца» да гледача: «У сучаснага чалавека болевы парог завышаны: штодня мы бачым у навінах, як нехта гіне. Тэракт, вайна, катастрофа — звычайныя элемэнты нашай інфармацыйнай прасторы. І чалавек прызвычайваецца: гэтыя жахі робяцца недзе там, далёка, не са мной. Мне здаецца, што фільм Гібсана — гэта і ёсьць спроба прабіцца да гледача, падняўшы вось гэты болевы парог». «Пасьля прагляду вельмі хочацца маліцца і прасіць прабачэньня за свае грахі, — згаджаецца грэка-каталік Зьміцер Ятчэня, удзельнік прагляду. — І ўражвае ня толькі майстэрства актораў, якія ў фільме зусім ня гралі, а перажывалі свае вобразы; і не спэцэфэкты, пра якія забываеш — і здаецца, што сапраўды са сьпіны вырываюць кавалкі жывога цела... Фільм вельмі эмацыйны і цяжкі. Аднак калі глядзіш яго, адчуваеш сябе ня тут, а там. І плачаш разам з Маці, і пакутуеш разам з Хрыстом, і просіш узгадаць цябе разам з асуджаным разбойнікам».

«Тым, хто пагляздеў гэты фільм, лягчэй было б расказваць пра Турынскую плашчаніцу, якая ўжо даўно ўвяла тэму натуралізму, паталягаанатоміі ў нашыя роздумы пра пакуты Хрыстовы. На Плашчаніцы сьляды пакутаў асабліва заўважныя…» — камэнтуе карціну для «НН» дыякан Расейскай праваслаўнай царквы Андрэй Кураеў. Увогуле, і каталікі, і праваслаўныя адзначаюць сярод галоўных вартасьцяў фільму адпаведнасьць Эвангельлю. Дзіўна, але вельмі малая частка хрысьціянаў сёньня можа пахваліцца глыбокім веданьнем эвангельскіх сюжэтаў. «Так, можа, тут няма нічога новага. Але ёсьць рэкляма, ёсьць падзея, і людзі мусяць неяк вызначыцца: ці яны з Хрыстом, ці не, прынамсі падчас прагляду», — адзначае Наста Рымашэўская, праваслаўная ўдзельніца прагляду.

«Мінус жа любога фільму на эвангельскую тэматыку ў тым, што ён вельмі жорстка злучае вобразы актора і таго, каго ён іграе, — адзначыў Кураеў. — Мы гаворым «Штырліц», а маем на ўвазе «Ціханаў». Кіно — надта жорсткае мастацтва. Як бы пад узьдзеяньнем кіно

**Працяг на старонцы 10.**

МЕРКАВАНЬНЕ БАГАСЛОВА

# Ці можна экранізаваць таямніцу збавеньня?

**Ксёндз Адам Банэцкі, рэдактар польскага тыднёвіка «Tygodnik Powszechny»:**



Галоўнай заслугаю «Пакутаў» зьяўляецца тое, што словы, якія вымаўляліся падчас імшы бальшынёю біздумна, — «Укрыжаваны за нас пры Понціо Пілаце, цярпеў і быў пахаваны; і на трэці дзень уваскрос…» — цяпер зноўку набываюць сэнс. У гэтым галоўная вартасьць фільму для хрысьціянаў.

Але ёсьць мноства сумневаў. Першы датычыць сьцьверджаньня аб тым, што фільм зьняты паводле Эвангельля. Гэта ня так. Ён зьняты паводле яго травэстацыі, запісу містычных візій Катарыны Эмэрых. Жорсткасьці, паказаныя ў Эвангельлі даволі агульна, там выступаюць у значным павелічэньні. У ім выкарыстаныя эпізоды з Эвангельля, але няма сапраўднай таямніцы.

Другая небясьпека ў тым, што глядач, які бачыць гэта жахлівае жорсткае злачынства супраць Хрыста, выходзіць з кінатэатру ўпэўнены, нібы таямніца Збаўленьня палягае ў тым, што Хрыстос цярпеў больш за ўсіх. Гэта не хрысьціянскае разумненьне. Укрыжаваньне тады выкарыстоўвалася часта, і сотні людзей цярпелі жахлівыя пакуты. Выключнасьць драмы Хрыстовай заключаецца ў адпрэчваньні яго як Бога.

Не паказана таксама, чаму габрэі вырашылі забіць Хрыста. З аднаго боку паказанае жыдоўскае рэлігійнае асяродзьдзе, якое поўніцца ірацыянальнай нянавісьцю і прагай сьмерці, а з другога боку — добры Хрыстос, які цярпіць, прымаючы гэта як волю Айца. Рымляне паказаныя ў фільме як большыя садысты, чым нават габрэі, але сам мэханізм нянавісьці запушчаны праз апошніх. Гэта згодна з Эвангельлем, але Эвангельле паказвае драматызм Першасьвятара, які знаходзіўся перад сапраўднай дылемаю і які бараніў рэлігійную рэчаіснасьць, у якую верыў. У фільме гэта не паказана, і таму ён можа ажывіць антысэміцкія стэрэатыпы, ад якіх Касьцёл за дзьве тысячы гадоў, развамжаючы пра пакуты Госпада, адышоў досыць далёка.

Урэшце, сам фільм як сродак перадачы веры небясьпечна ўцякае ў даслоўнасьць. У ім праўдзівасьць веры паказваецца як нейкія сымбалі. Сапраўды, было Сярэднявечча і Барока, калі натуралізацыя пакутаў Госпада ўзбуджала эмоцыі. Але Касьцёл пазьней адышоў ад таго. Думаю, што праваслаўны абраз — добры прыклад перадачы драматычных, пакутніцкіх рэаліяў спосабам, які пакідае месца для чалавечага ўяўленьня, перажываньня.

Даслоўнасьць жа прыводзіць да нядобрага выніку. Фільм ператвараецца ў схему, якая пры канцы робіцца невыноснай: існуе сьвет злых жыдоў ды рымлян і ёсьць добры Езус ды ягоныя сябры. Зло перамагае дабро. У апошнюю хвіліну, калі ўжо здаецца, што дабро зазнала паразы, надыходзіць дапамога з таго сьвету. Трасецца зямля, бурацца муры, жырандолі падаюць на галовы, усе ўражаныя, і дабро адыгрываецца на зьле. Толькі немагчыма зразумець, чаму сьведкі тых цудаў, усе жыды, не прынялі хрысьціянства. З боязьзю гляжу на выкарыстаньне гэтага фільму для мэтаў эвангелізацыі і душпастырства. Дэманстрацыя пакуты тут засланяе больш істотную таямніцу Збавеньня, якую на стужку зьняць цяжэй.

# «Не загасіць вам праўды яснай...»

Працяг са старонкі 1.

Для пэўнасьці яны «забясьпечылі магілу, прыклаўшы пячаткі да каменя і паставіўшы варту» (*Мц 27:66*). У такі спосаб яны думалі, што расправіліся зь ім назаўсёды. І памыліліся, бо разважалі чыста па-людзку, не зразумеўшы, што магіла не магла ўтрымаць Таго — і ніякія пячаткі не былі ў стане схаваць праўды пра Яго — хто сказаў пра сябе: «Я ёсьць дарога, і праўда, і жыцьцё» (*Ян 14:6*). Таму іхнія намаганьні аказаліся дарэмнымі, як гаворыцца ў адной з царкоўных нядзельных песьняў: «Хоць юдэі запячаталі магільны камень і жаўнеры сьцераглі ўсячыстае цела Тваё, Ты ўваскрос на трэці дзень, Хрысьце Спасе, даруючы сьвету жыцьцё». Дый пасьля ўваскрасеньня тыя самыя правадыры стараліся не дапусьціць весткі да народу і нават загадалі вучням Хрыста Пятру і Яну «не гаварыць пра



імя Ісуса», на што атрымалі адказ: «Судзіце самі, ці справядліва перад Богам слухаць больш вас, чым Бога?» (*Дз. 4:11—12*).

Сёньня сьвет, а зь ім і Беларусь, перажывае не найлягчэйшыя хвіліны. І таму зусім заканамерна ўзьнікае пытаньне, што значыць для нас сьвята Ўваскрасеньня Хрыстовага, якое мы зьбіраемся сьвяткаваць. Калі б мяне папрасілі даць адказ у некалькіх словах, дык я б сказаў, што гэтае сьвята дае мне ўпэўненасьць у канчатковай перамозе Праўды, якое нельга схаваць пад ніякімі пячацямі. Гэта тая Праўда, якая «зробіць нас свабоднымі» (*Ян 8:32*), бо безь яе мы сьляпыя і ня ў змозе зрабіць свабодны выбар. Гэта тая Праўда, што паказвае нам дарогу да адзінай крыніцы сапраўднага жыцьця — Госпада Ісуса Хрыста, якога магіла не магла ўтрымаць. Таму, нягледзячы на ўсе жыцьцёвыя цяжкасьці і нягоды, мы вітаем адно аднаго ў гэты дзень словамі, поўнымі радасьці і надзеі:

ХРЫСТОС УВАСКРОС!

Вялікдзень-2004

**а.Аляксандар Надсан, апостальскі візытатар для беларусаў замежжа**



# «Пакуты Хрыстовы»

Працяг са старонкі 9.

чалавек у сваіх малітвах ня ўзгадваў таго актора, якога бачыў на экране. Важна памятаць, што Хрыстос нашай малітвы і Хрыстос фільму — не адно й тое самае».

Як пазьбегнуць гэткага атаесамленьня? «Пытаньне пра дазволенасьць ці забароненасьць увасабленьня вобразу Езуса ў мастацтве няновае, — камэнтуе Андрэй Зноска, ксёндз з Горадні. — У Бізантыі VIII ст. палалі гарачыя спрэчкі паміж іканаборцамі, якія зьнішчалі абразы, і абаронцамі прававерная вучэньня, якое дазваляе шанаваць рукатворныя выявы Хрыста, Божай Маці ды сьвятых Божых. Тэхнічны прагрэс ідзе наперад, паўстаюць новыя формы выяўленчага мастацтва. Калі рэжысэр ставіць перад сабой няпростую мэту — перадаць у зрокавых вобразах Таямніцу Богачалавека, перакazаць на экране зьмест самай вядомай кнігі чалавецтва — Бібліі, немалаважную ролю грае тое, як ён сам ставіцца да Бога. Ад веры ці бязьвер'я творцы кінастужкі залежыць, што ён укладзе ў сваё мастацтва — любоў ці нянавісьць да Хрыста».

Гібсан у шматлікіх інтэрвію казаў, што стварыў гэты фільм як ікону — молячыся і просячы Бога, каб дазволіў выканаць Ягоную волю. Штодзень на здымачнай пляцоўцы была імша, у перапынках маліліся на Ружанцы… І ўсё ж кінакрытык Андрэй Расінскі Боскае прысутнасьці ў карціне не заўважыў: «Дзе тое, што калісьці было названа «трансцэндэнтальным стылем», які ўладна і пераканаўча сьведчыць пра звышнатуральнае? Такім стылем валодаў Таркоўскі, валодаў Карл Тэадор Дрэер, яго дэманстраваў японец Ясудзіра Одзу. Але ім ніколі не авалодае Мэл Гібсан. Так і застаецца карціна — з пасечаным кавалкам мяса, якая з камэрцыйных прычынаў чамусьці называецца «Пакуты Хрыстовы».

Яму супярэчыць Максім Жбанкоў: «Мне здаецца, што гэта некамэрцыйны фільм. І Гібсан, калі распачынаў праект, менш за ўсё хацеў зарабіць грошы. У яго нейкія свае асабістыя рахункі з хрысьціянскай верай. Наколькі я ведаю, ён быў вельмі сур'ёзна хворы на алькагалізм і потым знайшоў выратаваньне, як кажа, менавіта ў хрысьціянстве. Фільм перадусім арыентаваны на хрысьціянаў, гэта ёсьць прадукт менавіта галівудзкага верніка. І тут важныя гэтыя дзьве часткі: па-першае, вернік, бо тут няма ніякіх парафразаў, нейкіх жартачак, па-другое — прафэсійны галівудзкі прадукт, усё зроблена вельмі тэхнічна. Нават занадта.

Кажуць, нехта ўвераваў падчас прагляду «Пакутаў». Я ня пэўны, што гэты фільм сапраўды здольны некага навернуць, нягледзячы на тое, што гэта прафэсійна афармлены хрысьціянскі тэкст. Гэта не Эвангельле ад Гібсана і нават не апокрыф, дзе трэба асабістае перажываньне, гэта — толькі адлюстраваньне ўмоўнага канону хрысьціянства».

Сапраўды, гэты фільм не агітка. У ім, як і ў Сьвятым Пісьме, нават пераканаваны атэіст знойдзе нешта для сябе, нешта такое, што закранае і застаецца ў душы назаўжды. І глядзець яго безумоўна варта, хоць бы дзеля тае шчырасьці, зь якой ён здымаўся. Стваральнікі яго, рэжысэр дзячыў Богу. Праўда, абраў ён для гэтага надзвычай арыгінальную форму — уласнаручна ўкрыжаваў Хрыста.

**Андрэй Скурко, Мікола Арцюхоў, Руслан Равяка**

### Бізнэс на «Пакутах»

У амэрыканскіх крамах можна набыць цьвікі даўжынёю 6 см для ўкрыжаваньня — такія ж, як тыя, што ўжываліся на здымках фільму. Каштуюць яны ўсяго 17 даляраў і маюць надпіс «Ён быў прыбіты за нашы грахі». Цьвікі — на падставе дамовы з Гібсанам — робіць каліфарнійская фірма. У крамы разаслана ўжо больш за 75 тысяч. Апроч іх у любым штаце можна купіць кніжкі, бірулькі для ключоў, кубкі і кашулькі з сымболікай фільму.

# Сьвятыя не для ўсіх

**Чым сьвятыя заслужылі шанаваньне вернікаў? І ці сапраўды так цяжка стаць сьвятым? Каго зь беларускіх сьвятых шануюць і каталікі, і праваслаўныя?**



Цікава, што ў першых вякох Царквы ўсе хрысьціяне называлі сябе сьвятымі, а разам — Царквой сьвятых, пра што і кажуць Дзеі Апосталаў. Ад Хрыста вернікі не адракаліся нават падчас катаваньняў, бо сьмерць для іх была ўсяго толькі пачаткам вечнага жыцьця.

Сьвятыя ня ёсьць пасярэднікамі паміж Богам і людзьмі, як гэта часта лічыцца. Яны — як бы прыклад для хрысьціянаў.

Культ сьвятых яднае каталікоў і праваслаўных, але розьніць іх ад некаторых пратэстантаў, якія сьвятых не прызнаюць, хаця, варта адзначыць, шануюць айцоў веры.

У гонар сьвятых будуюцца храмы. Кожны дзень царкоўнага календара прысьвячаецца нейкаму сьвятому. Кожны сьвяты шануецца як апякун пэўных грамадзкіх слаёў, прафэсіяў або групаў людзей. Так, сьвяты Язэп лічыцца патронам сям'і, рабочых, дзяцей і моладзі; сьвяты Валянцін — апякуном закаханых, сьвяты Ізыдар (560—636) — патронам Інтэрнэту, сьвяты Тамас Мор (1478—1535) — апекуном палітыкаў.

Калі казаць пра супольных сьвятых каталікоў і праваслаўных, дык гэта перадусім сьвятыя, праслаўленыя да 1054 г. Такіх каля паловы календара.

Чаму ўсяго палова? Сталася гэта праз тое, што багата сьвятых I—X ст. былі кананізаваныя пасьля Падзелу.

Таму сярод беларускіх сьвятых, кананізаваных пасьля 1054 г., няма такіх, якіх бы шанавалі і праваслаўныя, і рыма-каталікі. А вось грэка-каталікі і праваслаўныя разам шануюць Эўфрасіньню Полацкую, Кірылу Тураўскага, Мяркура Смаленскага, Марціна Тураўскага, Сімяона Полацкага, Віленскіх пакутнікаў — карацей, тых, хто жыў да 1596 г.

Адзначым, што ні Каталіцкая, ні Праваслаўная цэрквы не абавязваюць, але й не забараняюць шанаваць сьвятых, праслаўленых іншай канфэсіяй.

**Мікола Арцюхоў**

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

Кіраўніка Мастоўскай суполкі «Маладога фронту» **Зьмітра Кухлея** 21 сакавіка затрымалі міліцыянты й забралі частку накладу бюлетэню «Права на волю», а 25 сакавіка яго спрабавалі завэрбаваць КДБісты. Людзі ў цывільным затрымалі 28 сакавіка ў Менску каля сядзібы БНФ **Уладзімера Малея**, **Міхала Напрэйкава** і **Мікалая Карповіча** — гадзіну іх пратрымалі ў Савецкім РУУСе, а потым папрасілі прабачэньня за памылку ды адпусьцілі. 28 сакавіка кандыдата ў лідэры МФ **Зьмітра Дашкевіча** ў цягніку «Менск—Вільня» вэрбавалі супрацоўнікі спэцслужбаў. 29 сакавіка ў судзе быў аштрафаваны на 2625 тыс.руб. кожны з арганізатараў сьвяткаваньня Дня Волі ў Салігорску — **Аляксей Прыходзька**, **Натальля Зубарэвіч**, **Марыя Волчак**, **Ларыса Алешка**. Менская падатковая інспэкцыя 31 сакавіка адмяніла пастанову аб спагнаньні зь **Беларускага Хельсынскага камітэту** 380 млн руб. санкцыяў: падаткавікі маюць перагледзець штраф у адпаведнасьці з новым указам. Крымінальная справа супраць БХК за «нявыплату падаткаў» ня спыненая. Улады Вялейкі адмовілі дэпутатам райсавету **Сяргею Клімёнку** (АГП) і **Язэпу Мацыюну** (ПКБ) у правядзеньні сустрэчы з выбарцамі. **Дзяніс Буйніцкі**, які на Дзень Волі прыкуў сябе ланцугамі на Кастрычніцкай пл. у Менску, 31 сакавіка быў выгнаны з БРСМ «за прычыненьне шкоды дзелавой рэпутацыі арганізацыі». Старшыня нізавой арганізацыі ААТ «Полацак-Шкловалакно» **Віктар Стукаў** 31 сакавіка атрымаў паведамленьне аб звальненьні, якое зьвязвае з прафдзейнасьцю. 2 красавіка на 2 б.в. быў аштрафаваны старшыня Свабоднага прафсаюзу мэталістаў аршанскай фірмы «Лёс» **Васіль Леўчанкаў**. Нумар газэты **«Наша позиция»**, органу Белхімпрафсаюзу ВА «Беларуськалій», 2 красавіка арыштаваў выдавец: кіраўніцтву прадпрыемства не спадабаўся здымак з пашыранага паседжаньня прафкаму «Не — кантрактнай сыстэме найму!». З выпускным рэдактарам газэты **Мікалаем Малышчыцам** і журналісткай **Ларысай Насановіч** не працягнутыя кантракты. Гомельскае аб'яднаньне **«Грамадзянская альтэрнатыва»** 2 красавіка атрымала ад управы юстыцыі аблвыканкаму адмову ў рэгістрацыі. Актывістаў «Зубра» **Аляксея Ляўковіча** і **Максіма Громава** затрымалі 2 красавіка ў Менску падчас расклейкі ўлётак: іх прамарынавалі ў пастарунку больш за дзьве гадзіны і адпусьцілі без пратаколу. 5 красавіка папярэджаньне ад управы юстыцыі Віцебскага аблвыканкаму атрымала грамадзкае аб'яднаньне моладзі **«Верас»**: арганізацыі закідаюць, што яна ў парушэньне статуту правяла 3 сьнежня 2003 г. круглы стол па міжнацыянальных адносінах. 5 сакавіка супрацоўнікі Кастрычніцкага раённага аддзелу барацьбы з эканамічнай злачыннасьцю (Віцебск) сканфіскавалі кампутар і каляровы прынтэр **Віктара Шляхціна** з штаб-кватэры перадвыбарчага блёку **«Маладая Беларусь»** па падазрэньні ў вырабе… «фальшывых даляраў».

**АШ**

# Зямля і неба ў адной лізе

**У 2003 годзе ў Беларусі гулялі паўтары тысячы прафэсійных футбалістаў, на палёх краіны выступалі 317 камандаў. Свае грашовыя справы беларускі футбол трымае ў сакрэце, аднак пэўнае ўяўленьне пра іх можна скласьці. 15 красавіка стартуе 14-ы нацыянальны футбольны чэмпіянат.**

Дзе тыя галасы, якія на пачатку 90-х казалі пра неабходнасьць нейкага «першынства СНД»? Уласны футбольны чэмпіянат і права дэлегаваць клюбы ў эўрапейскія спаборніцтвы — такая ж адзнака незалежнасьці краіны, як грашовая адзінка.

Хіба Шатляндыя ды Паўночная Ірляндыя, не зьяўляючыся самастойнымі дзяржавамі, праз прыналежнасьць да Вялікай Брытаніі могуць штогоду выпускаць свае клюбы ў бурлівыя воды кубкавых турніраў кантынэнту. Аднак гэта — узаконенае выключэньне. Беларусь, калі б апынулася яна ў якім «непарушным саюзе», наўрад ці далучылі б да згаданай кампаніі.

## Камандаў — мех, а інтрыгі — на грэх

Наш футбол нават у дробязях паўтарае настальгічныя парываньні ягоных высокапастаўленых прыхільнікаў. Кагорта найлепшых беларускіх клюбаў мае назву «вышэйшая ліга» — акурат як футбольная эліта Савецкага Саюзу. Складаецца яна з шаснаццаці камандаў — столькі ж мела вышэйшая ліга чэмпіянату СССР. Для краіны з такімі сьціплымі футбольнымі дасягненьнямі, як Беларусь, гэта зашмат. Таму ў вышэйшай лізе выступае некалькі адносна мацнейшых калектываў і процьма слабых. Няма чаго зьдзіўляцца, калі сярод вынікаў матчаў заўважаеш фантастычныя 9:0 (леташняе супрацьстаяньне «Шахцёру» і «Зьвязды-ВА-БДУ») або 7:0 (БАТЭ-«Славія»). Ажно 49 гульняў скончылася ў мінулым чэмпіянаце з буйным разрывам у ліку.

На карысьць футболу гэта ня йдзе: добрая палова клюбаў утульна сядзіць у сярэдзіне табліцы, не баючыся вылету ў ніжэйшы дывізіён і не псуючы сабе нэрвы змаганьнем за мэдалі. Дыскусіі на тэму скарачэньня вышэйшай лігі вядуцца кожную вясну. Большасьць спэцыялістаў выступае за скарачэньне. Як зазначае гарачы прыхільнік рэформы, дырэктар бабруйскай «Белшыны» Алег Гушча, гэта ажывіць канкурэнцыю і ў першым дывізіёне, дзе цяпер за перамогу змагаюцца ўсяго тры-чатыры каманды. Аднак далей за словы справа ня рухаецца. Відаць, рэч тут у нязгодлівасьці «адказных таварышаў» адпрэчыць савецкую любоў да гігантызму.

У вышэйшым дывізіёне першынства Славеніі — 12 клюбаў, Швайцарыі — 10, Аўстрыі — 10. Футбольны патэнцыял гэтых краінаў больш-менш супастаўны зь беларускім, а вось дасягненьні — вышэйшыя. Там цьвяроза глядзяць на рэчы і абіраюць якасьць, а не паказную колькасьць. А праблема, зьвязаная са зьмяншэньнем гульнёвай практыкі камандаў, вырашаная ў чэмпіянатах гэтых краінаў проста: спаборніцтвы праходзяць ня ў два туры, а ў чатыры.

## Баба дзесяцёх варты

Калі 10 гадоў таму з трыбунаў стадыёну «Дынама» падчас амаль кожнай міжнароднай сустрэчы чуліся расісцкія воклічы, то цяперашні беларускі заўзятар значна больш паліткарэктны. Гэта адбылося дзякуючы зьяўленьню ва ўнутраным чэмпіянаце сваіх афрыканцаў і бразыльцаў. Такія тэхнічныя і эфэктныя гульцы, як былы менскі дынамавец Баба Адаму (Гана) або бразыльскі форвард сталічнага «Тарпэда» Эду, сталі любімцамі публікі.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Наваполацкі «Нафтан» і менскае «Дынама» (на фота) застаюцца сярод прэтэндэнтаў на перамогу ў футбольным чэмпіянаце**

А вось калі тры гады таму югаслаўскі трэнэр мазырскай «Славіі» Ўлада Петравіч запрасіў у каманду васьмёх суайчыньнікаў, пачаўся ледзь не міжнацыянальны канфлікт і неўзабаве югаславы пакінулі Беларусь, а «Славія» — лідэрскія пазыцыі.

Баба Адаму ў пошуках лепшае долі таксама паехаў зь Менску, спрабаваў сілы ў Маскве, аднак не падышоў аднайменнаму расейскаму клюбу й згубіўся недзе ў Эўропе. Выступалі летась у нас баўгарын Петар Злаціна ў (менскае «Дынама»), літоўцы Аўдрыс Вяйкуціс («Тарпэда-СКА») і Ёнас Пятраўскас («Дарыда»), грузіны Суліко Какабадзэ («Нафтан»), Георгі Бэрыянідзэ (менскі «Лякаматыў»), два гады таму — румын Ліка, нігерыйцы Махамэд Сані і Пітэр Кая («Тарпэда-СКА»). Першым жа афрыканцам, які гуляў за беларускі клюб, быў Крыстафэр Чэ з Камэруну (магілёўскае «Тарпэда-Кадзіна»)... Сёлета ў дапамогу Эду сталічнае «Тарпэда» заключыла кантракты зь яшчэ двума бразыльцамі — Андрэ Сантасам і Ціага Матасам. Шмат у Беларусі не заробіш, аднак наш чэмпіянат падаецца многім менш клопатным, чым, скажам, расейскі ўнутраны турнір. Тут ня трэба шматгадзінных авіяпералётаў, напрыклад.

Большасьць легіянэраў, якія выходзяць на поле ў майках айчынных футбольных дружынаў, маюць расейскае, радзей украінскае грамадзянства. Яны не хапалі зорак зь неба дома, ня робяць гэтага й тут. Аднак кіраўнікі клюбаў упарта аддаюць перавагу ім, а не гульцам сярэдняга эўрапейскага ўзроўню. Спрацоўвае звычка. Хіба толькі «ўсходняя палітыка» «Гомелю» дала плён: у асноўным складзе чэмпіёнаў пасьпяхова гулялі летась расейцы Антон Іваноў, Дзьмітры Карсакаў ды ўкраінец Юры Суліменка.

## Без нацыянальных рысаў

Футбольны чэмпіянат начыста пазбаўлены нацыянальных рысаў. Варта паглядзець на назовы клюбаў. Сярод удзельнікаў вышэйшай лігі маем два «Дынама», два «Тарпэда»,



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Бразыльскі форвард сталічнага «Тарпэда» Эду рыхтуецца да сэзону**

«Белшыну», «БАТЭ», «Лякаматыў», «Нафтан», «Шахцёр», «Дняпро-Трансмаш», «МТЗ-РІПА»... Яшчэ адзін удзельнік названы так, каб кожны, прамаўляючы яго назоў, шырока пазяхнуў: «Зьвязда-ВА-БДУ». Прыемнае выключэньне складаюць хіба «Гомель», «Нёман» ды «Славія»... Да гульні гэта ўсё нібы дачыненьня ня мае. Галоўнае, каб прадпрыемствы падтрымлівалі сваіх спартовых фамільянтаў, што адбываецца не заўсёды.

Фінансаваньне застаецца галоўнай праблемай. Прэзыдэнцкі загад абавязаў прамысловасьць краіны апекавацца футболам, але ня кожнаму прыйшоўся даспадобы. Клюбы сталі дачынымі прадпрыемствамі, і шмат хто з «бацькоў» лічыць, што «дачок» ім папросту навязалі: сваіх праблемаў хапае, а тут яшчэ нейкія футбалісты...

У 2003 г. у Беларусі гулялі амаль паўтары тысячы прафэсійных футбалістаў, на палёх краіны выступалі 317 камандаў. Свае грашовыя справы беларускі футбол трымае ў сакрэце, аднак пэўнае ўяўленьне пра іх можна скласьці. Напрыклад, параўнаўшы заробкі айчынных і расейскіх рэфэры. Беларускі арбітар за абслугоўваньне гульні вышэйшай лігі атрымлівае каля 300 тыс. рублёў. Частка зь іх ідзе на праезд да месца правядзеньня матчу, пражываньне й харчаваньне. А расейскі калега за матч у прэм'ер-лізе зарабляе 45 тыс. расейскіх (3 млн 375 тыс. на нашыя), без уліку прэміяльных. І ў заробках футбалістаў розьніца такая ж.

Вось і «дояць» футбольныя дочкі дзяржаўных мацярок. Сродкі патрэбныя на заробкі, на паездкі ў іншыя гарады, на складкі за ўдзел у чэмпіянаце, на разьвіцьцё інфраструктуры, на такую, здавалася б, банальную рэч, як спартовая экіпіроўка, на арганізацыю міжсэзонных трэніровачных збораў дзе-небудзь у Турцыі...

Паказальны ў гэтым сэнсе прыклад «МТЗ-РІПА» — каманды, якая ўтварылася на аскепках менскага «Трактару». Летась, уразіўшы неймавернымі пераможнымі сэрыямі, яна заваявала права выступаць сярод наймацнейшых. Раней жа, пакуль гэты калектыў ня трапіў пад пяшчотнае крыло Інстытуту прафэсійнай адукацыі, ён існаваў на чыстым энтузіязьме. Грошай спартоўцы не атрымлівалі па паўгоду, аўтобусы, у якіх футбалісты выяжджалі на матчы, ламаліся на паўдарозе, а на стадыёне, дзе яны праводзілі хатнія сустрэчы, была адключаная гарачая вада.

Знайшоўся фанатычны заўзятар — дырэктар Інстытуту Аркадзь Шкляр. Аднак такіх дабрадзеяў няшмат. Той жа «Белнафтахім», што спансуе «Белшыну», паводле чуткак, усяляк намагаецца пазбавіцца ад «кліентаў».

Жаруць грошы й стадыёны. Нават найлепшыя футбольныя аб'екты рэгулярна сутыкаюцца з заўвагамі камісіяў УЭФА. Найчасьцей праз адсутнасьць плястыкавых сядзеньняў і грамадзкіх прыбіральняў. Так, сымпатычная «Дарыда» з Ждановічаў, каманда вышэйшай лігі, праводзіла хатнія гульні на арэне, якая больш нагадвала школьную спартовую пляцоўку. Толькі напярэдадні новага сэзону клюб арандаваў-такі менскі стадыён «Тарпэда».

Эўрапейская футбольная арганізацыя пільна сочыць за тым, каб падчас матчаў гледачы пачуваліся камфортна і бясьпечна. Таму Беларусь мае лічаныя палі, на якіх дазваляецца праводзіць міжнародныя сустрэчы. На сталічным «Трактары» і ў Маладэчне можна прымаць матчы турніраў. Адзін толькі менскі «саракатысячнік» «Дынама» адпавядае ўсім нормам. Сярэдняя наведвальнасьць гульняў на чэмпіянаце складае, дарэчы, пад тры тысячы чалавек за матч.

У сёлетнім першынстве за мэдалі, як чакаецца, ізноў будуць змагацца «Гомель», БАТЭ, менскае «Дынама», «Шахцёр» ды «Тарпэда-СКА». Найцікавейшымі сустрэчамі ў першым туры абяцаюць быць матчы зь іх удзелам. Чэмпіёны краіны, гамельчукі, у гасьцёх будуць супрацьстаяць «Зьвяздзе-ВА-БДУ» зь Менску, барысаўчане прымуць на сваім полі наваполацкі «Нафтан», менскае «Дынама» выправіцца ў госьці да «Белшыны».

**Алег Ждановіч**

## Матчы 15 красавіка

| |
|---|
| «Зьвязда-ВА-БДУ» (Менск) — «Гомель» |
| БАТЭ (Барысаў) — «Нафтан» (Наваполацак) |
| «Белшына» (Бабруйск) — «Дынама» (Менск) |
| «Шахцёр» (Салігорск) — «Нёман» (Горадня) |
| «Тарпэда» (Жодзіна) — МТЗ-РІПА (Менск) |
| «Лякаматыў» (Віцебск) — «Тарпэда-СКА» (Менск) |
| «Дняпро-Трансмаш» (Магілёў) — «Дынама» (Берасьце) |
| «Дарыда» (Ждановічы) — «Славія» (Мазыр) |

# Электронны перакладчык

**У сярэдзіне траўня адбудзецца прэзэнтацыя кампутарнай праграмы «Расейска-беларускі й беларуска-расейскі перакладчык». Праграма будзе працаваць пад два нарматыўныя стандарты беларускай мовы — наркамаўку й тарашкевіцу. Гэта тое, чаго выдаўцы чакалі цэлае дзесяцігодзьдзе.**

Стварэньне праграмы ініцыявала Таварыства беларускай мовы. Распаўсюджвацьме яе будуць бясплатна. Адзіная ўмова стваральнікаў — абавязковая рэгістрацыя пры атрыманьні распрацоўкі: кожныя 3—4 месяцы мяркуецца абнаўленьне праграмы і аўтары ня хочуць бачыць у спажыўцоў няякасны прадукт.

Працу над такой самай праграмай на замову дзяржаўнага Фонду інфарматызацыі з 1998 г. вядуць навукоўцы факультэту прыкладной матэматыкі й інфарматыкі БДУ (кіраўнік праекту прафэсар Ігар Соўпель). Адзінае адрозьненьне — у распрацоўцы БДУ ўжываецца толькі наркамаўка. Іх электронны перакладчык — на стадыі дапрацоўкі. Як паведаміла «НН» адна з стваральніц праграмы Натальля Рубашко, праграма з БДУ мае зьявіцца пры канцы году.

У Інтэрнэце зь лістапада 2002 г. можна скачаць беларуска-расейскі перакладчык «Белазар». Праграма пастаянна абнаўляецца і дапрацоўваецца: цяпер у ёй па 40 тыс. слоўнікавых артыкулаў у кожнай моўнай частцы. Бяда, што робіцца яна аматарскімі намаганьнямі і пакуль далёкая ад дасканаласьці.

У праекце ТБМ асноўную тэхнічную працу зрабіў супрацоўнік Інстытуту электронікі Акадэміі навук Хведар Піскуноў. «Электронныя праграмы — гэта такі ж элемэнт сувэрэнітэту, як уласныя энцыкляпэдыі», — упэўнены сп.Хведар.

Сёньня «перакладчык» мае каля чатырох мільёнаў словаў у двух варыянтах — з малой літары і зь вялікай (на той выпадак, калі з гэтага слова пачынаецца сказ). Падобныя праграмы-перакладчыкі на расейскай ці ўкраінскай мовах таксама маюць базу 4—4,5 млн.

У працы над праграмай бралі ўдзел Аўгіньня Волкава, Валянціна Авілава, Уладзімер Кошчанка, лінгвістычныя кансультацыі давалі прафэсар Генадзь Цыхун, Зьміцер Саўка, Вінцук Вячорка, Юрась Бушлякоў. Лексычнай асновай праграмы сталі слоўнікі, а таксама сайты «Нашай Нівы», «Звязды» і электроннай бібліятэкі «Беларуская палічка». Апрача агульнай лексыкі, у праграму былі ўлучаныя і ўласныя імёны: геаграфічныя назовы (усе гарады, мястэчкі — аж да назваў сельсаветаў і найзначнейшых вёсак) і імёны вядомых у гісторыі Беларусі асобаў.

Адзінае, чаго яшчэ бракуе «перакладчыку», — уласнага запамінальнага імя. Аўтары яшчэ шукаюць найлепшы адпаведнік. Чаму б не назваць праграму імем самага вядомага зь беларускіх перакладчыкаў — Скарыны? «Выглядала б нясьціпла», — не наважваецца Хв.Піскуноў.

**Адам Воршыч**


Андрэй Лянкевіч

**Хведар Піскуноў стварыў праграму, якой будуць карыстацца мільёны.**

# Міхалок захапіў Украіну


Андрэй Лянкевіч

**Узбуджаны плённым ужываньнем «Крамбамбулі», Сяргей Міхалок праяўляе ўсё большую актыўнасьць. Днямі, адначасна ў Беларусі, Расеі й ва Ўкраіне, выходзіць чарговы альбом «Ляпіса Трубяцкога», назва якога — «Золотые яйцы» — яўна заснаваная на гульні філялягічнымі штучкамі. У альбоме дзьве новыя беларускамоўныя песьні.**

Старая песьня — «Любові капец» з самай першай праграмы гурту — перазапісаная з удзелам біг-бэнду МУС. На загалоўную песьню альбому адзьняты пацешны кліп.

Але Міхалку гэтага мала. Ён у вобразе Сірожы разам з сваім хаўрусьнікам Сашам днямі расьсьмяшыў усю Ўкраіну. Этэр захапілі татальна: іх галасы чуваць на дзьвюх радыёстанцыях ды яшчэ на адным тэлеканале. Стылістыка ўсё тая ж — адно што ўстаўляюць час ад часу дзеля жоўта-блакітнага слаўца і тамтэйшыя выразы. «Опэра для лянівых», кажуць, пайшла ва Ўкраіне на «ўра». Там Саша і Сірожа, пэўна, на зразумелай мове растлумачаць, чаму паказ гэтай опэры не дазволілі ў беларускім этэры.

А іх прадусар Яўген Калмыкоў нядаўна быў заўважаны ў адной з музычных крамаў за ганебным учынкам: ён яўна хацеў набыць альбом групы «Краски». Аднак своечасова заўважыў гнюсных папарацы і з словамі «Шкада, але грошай з сабой ня маю» змушаны быў паставіць дыск на палічку… Так яму і паверылі!

**Адам Лепель**

# «Тройца» напагатове

**Дыск, канцэрты, фольк-спэктакль — найбліжэйшыя пляны «Троіцы».**

«Празь дзьве з паловай гадзіны новы альбом «Тройцы» будзе гатовы», — сказаў па тэлефоне ў пятніцу ўвечары новы прадусар гурту Валер Мазур. Дыск атрымаў назоў «Сем», яго рэліз прызначаны на травень, тады ж адбудзецца і менская прэзэнтацыя. Сёе-тое з новае працы змогуць у хуткім часе пачуць берасьцейцы — 17 красавіка гурт мае даць канцэрт у мясцовым Тэатры драмы й музыкі (пачатак а 19-й). Ініцыятыўны ды амбітны прадусар хоча ўваскрасіць і фольк-спэктакль Івана Кірчука «Вважбіт», які быў паказаны толькі аднойчы з год таму. Плянуецца, што пройдзе ён у Тэатры юнага гледача, рэпэтыцыі пачнуцца празь некалькі тыдняў. Што да шоў-праекту «Руны», дык тут пытаньне з выданьнем дыску завісла. Цяпер матэрыял знаходзіцца ў Маскве, і немаведама, калі яго давядуць да розуму. Падобна, што імпэт расейцаў адносна беларускай музыкі крыху згас.

**Сяргей Будкін**


Андрэй Лянкевіч

**Іван Кірчук больш не адчувае зацікаўленьня з боку Расеі**

## Сайт «Дзеяслова»

Новы беларускамоўны літаратурны рэсурс мае адрас www.dziejaslou.by. На ім зьмешчаныя тэксты часопісу (першыя тры нумары — у адкрытым доступе) і навіны.

## Каталёг старадрукаў

Гарадзенскі гісторыка-археалягічны музэй надрукаваў каталёг выданьняў XV—XVI ст., якія захоўваюцца ў яго фондах. Гэта першае апісаньне найбольш старой і каштоўнай часткі 23-тысячнага кнігазбору ўстановы. У 260-старонкавую кнігу ўвайшлі апісаньні выданьняў славутых эўрапейскіх першадрукароў, а таксама кнігазборы прыжыцьцёвых выданьняў Яна Глагоўчыка, Марціна Лютэра й інш.

## Луцкевіч-штрасэ

У суботу 10 красавіка ў 10.50 на БТ пройдзе перадача з сэрыі «Адкрыты архіў» (аўтар Алесь Матафонаў). У праграме перадачаў яна пазначаная як «Юбілей», аднак аўтарскі калектыў называе яе «Луцкевіч-штрасэ». Перадача прысьвячаецца назвам вуліцаў у Менску часоў фашыстоўскай акупацыі й адной з вэрсіяў Купалавай сьмерці. Бяруць удзел гісторыкі Віталь Скалабан і Іван Сацукевіч. На «Ладзе» ж у нядзелю, 11 красавіка, адновіцца выхад «Альхіміі слова». Першы выпуск адбудзецца ў 10.15. Новая «Альхімія слова» будзе адрозьнівацца ад ранейшых выпускаў большай колькасьцю кампутарных эфэктаў.

## Радзівілы ў Міры

Вызначаная дата правядзеньня фэсту «Мірскі замак» — 31 траўня. Там пройдзе выстава партрэтаў князёў Радзівілаў і канцэрты. Запрашэньне атрымалі рыцарскія клюбы, аркестар Міхаіла Фінберга, гарадзенская капэла. Фэст, заплянаваны як двухдзённы, уцісьнецца ў адзін дзень празь недафінансаваньне.

## У тэатар задарма

На радыёканале «Культура» зьявіўся новы праект «Інтэлектуальны маратон» — інтэлектуальная віктарына, якая будзе гучаць у красавіку штодзень. З 11-й да 17-й пры канцы кожнай гадзіны вядоўцы будуць задаваць пытаньні. Адказы прымаюцца праз тэлефон цягам 10 хвілінаў. Пераможцы атрымліваюць бясплатныя квіткі ў тэатры і на канцэрты, кнігі. У FM-дыяпазоне «Культуры» можна чуць на частаце 102,9 МГц.

## Мэрль памёр

У 95 гадоў памёр Рабэр Мэрль — францускі пісьменьнік-камуніст, аўтар сацыяльнага раману «За шклом» (1970) пра студэнцкі рух 1968 г. і навуковай фантастыкі («Разумныя жывёлы», «Мальвіль»). Праславіўся таксама біяграфіяй Фідэля Кастра.

## Будзь Пуаром

Унук Агаты Крысьці, ейны спадкаемца Мэцью Прычард даў згоду на адаптацыю бабіных раманаў для кампутарных гульняў. Фірма «Chorion» ужо «пераклала» для гульняў 79 раманаў і апавяданьняў.

**АВ; БелаПАН, Gazeta.pl**

МЕНСКАЯ КІНАПРЭМ'ЕРА

# Блубэры



Францыя — Мэксыка — Вялікая Брытанія, 2004, каляровы, 124 хв.
Жанр: Містычны вэстэрн
Адзнака: 6 з 10

Рэжысэр забароненага ў Беларусі «Дабэрмана» Ян Коўнэн прапануе нам псыхадэлічную вандроўку, замаскаваную пад вэстэрн.

Дзесьці на Дзікім Захадзе шэрыф Майкл Блубэры зноў сутыкаецца з старым ворагам — і мусіць пакараць яго ды аднавіць справядлівасьць. Але аднаўленьне гэтае адбываецца самым нестандартным і галюцынацыйным чынам.

Па-першае, сам Блубэры (Вэнсан Касэль) не такі ўжо й «белы чалавек» — героя калісьці вылечылі індзейцы, і цяпер шэрыф мае схільнасьць да містыкі й духоўных практык. Па-другое, галоўны нягоднік (Майкл Мэдсан) таксама імкнецца зусім не да золата й купкі даляраў, а да схаванай у гарах сьвятой сілы, каб забіваць адной сваёй кепскаю воляй. Натуральна, што ў такіх умовах бойка паміж Дабром і Злом зьдзяйсьняецца ня столькі на кольтах (хаця й гэта ў карціне маецца), колькі ў мэнтальнай — кампутарнай прасторы.

Містычнага каўбоя прыдумаў шчэ ў 60-я мастак коміксаў Жан Жыро, больш вядомы як «Мёбіюс» і аўтар кібэрпанкаўскага «Стальца». Эстафэту падхапіў Ян Коўнэн, які таксама захапляецца шаманствам, псыхадэлікай і ініцыяцыямі.

У выніку на вялікім экране б'е ў вочы кліпавы мантаж дэталяў, велічна лунае камэра над каньёнамі, агаломшваюць мэдытатыўнасьцю лічбавыя скаляпэндры й павукі.

Акторы ў фільме — статысты ўзьнёслых пэйзажаў і трызьненьняў. Нат Джульет Льюіс дазволена праявіць сябе толькі ў адной сцэне — сьпеваў, а апошнія кадры падводных любошчаў (выклікалі ў залі радасную гістэрыку) ператвараюць ейнае цела ў непераможны сымбаль Маці-Прыроды, у якой расьцярушваецца вэстэрнавы, мужчынскі пачатак.

Культуролягі, альхімікі, шаманы, фаны Карласа Кастанэды, аматары фрактальнай геамэтрыі і наркаманы-пачаткоўцы прызнаюць карціну абсалютна сваёй. Усе астатнія гледачы будуць уражаныя проста асобнымі дэталямі фільму.

Але, колькі б ні казалі пра няўцямнасьці, недахопы сцэнару, пра прыцісканьне акторскай гульні на карысьць кампутарнага арнамэнту, Ян Коўнэн ведае, што кіно — гэта яшчэ й намаўленьне, кіно — гэта гіпноз.

І на «Блубэры» ён дзейнічае.

**Андрэй Расінскі**

# Народны альбом



«Канцэрт «Народнага» — той жа спэктакль, які кожны раз бачыш наноў», — кажа бацька праекту Міхал Анемпадыстаў. Выступ «народнікаў» хоць раз-два на год ужо стаўся традыцыяй. Нааагул жа гэта 15-ы выступ музыкаў у рамках «Народнага альбому». У НА узялі ўдзел больш за 20 чалавек. У абсалютнай большасьці песень удзельнічалі: Лявон Вольскі з рытм-сэкцыяй «N.R.M.» (Ляўкоў і Дземідовіч), Кася Камоцкая і баяніст Сяргей Ахрамовіч. Былі яшчэ Слава Корань, Аляксандар Памідораў, Зьміцер Вайцюшкевіч... Іх усіх можна будзе пабачыць на сцэне КЗ «Мінск» на Вялікдзень — 11 красавіка. Сёлетні канцэрт плянуецца запісаць і выдаць асобным дыскам. «Думаю, канцэртная вэрсія будзе ня менш цікавай за студыйную, бо на жывых выступах песьні гучаць зусім паіншаму», — кажа М.Анемпадыстаў. Канцэртны дыск плянуецца выдаць у верасьні—кастрычніку.

## АФІША

## Тэатры

### Тэатар імя Янкі Купалы

**7 і 8 красавіка** (ср, чц) — «Паўлінка».
**9 красавіка** (пт) — «Парфён і Аляксандра». Пастараль.
**10 красавіка** (сб) — «Свае людзі — паладзім».

### Балет

**9 красавіка** (пт) — «Шчаўкунок».
**11 красавіка** (ндз) — «Лебядзінае возера».

### Музычны тэатар

**8 красавіка** (чц) — «Капялюш Напалеона».
**9 і 10 красавіка** (пт, сб) — «Юнона і Авось». Рок-опэра.

### Тэатар моладзі

**9 красавіка** (пт) — «Шчасьлівы востраў».
**10 красавіка** (сб) — «Акадэмія сьмеху».

### Тэатар юнага гледача

**9 красавіка** (пт), экспэрымэнтальная сцэна — «Апошняя дуэль».

### Палац Рэспублікі

Малая заля.
**9 красавіка** (пт) — «Эрнэст».

### Тэатар беларускай драматургіі

**9 красавіка** (пт) — «Адвечная песьня».
**10 красавіка** (сб), 12.00 — «Хрустальны туфлік». Баль-маскарад.
**10 красавіка** (сб) — «Понцій Пілат».

### Тэатар драмы «Дзе-Я»

**9 красавіка** (пт) — «Рамантыкі».
**10 красавіка** (сб), 11.00 — «Новыя прыгоды старых знаёмых». Казка.

### Клюбны тэатар «Райскі сад», прадусарскі цэнтар «Данькоў»

**10 красавіка** (сб), 13.00 — «Фабрыка цацак». Тэатралізаванае прадстаўленьне з салодкім пачастункам. 13.00.

Пачатак спэктакляў а 19-й, калі не пазначаны іншы час

## МУЗЭІ, ВЫСТАВЫ

### Музэй вайны

пр.Скарыны, 25а, тэл. 227-56-11, з 10 да 18, вых. панядзелак.
**Беларускі ваенны жывапіс**. Карціны з фондаў музэю.
**Беларуская ваенная акварэль.** Да 30 красавіка.

### Галерэя «Верхні горад»

пл.Свабоды, 5, тэл. 223-45-47, з 9 да 19, вых. нядзеля.
**Гармонія вакол нас**. Выстава беларускіх мастакоў. Да 15 красавіка.

### Галерэя «Мастацтва»

пр. Скарыны, 12, тэл. 227-83-63, з 10 да 20, вых. нядзеля.
**Яе вялікасьць акварэль**. Уладзімер Рынкевіч. Да 14 красавіка.

### Галерэя «ONIK»

вул. Сьвярдлова, 4, 3-ці паверх, тэл. 227-10-75, з 12 да 18, вых. нядзеля.
**Эратычныя малюнкі Тацяны Беразоўскай.** Да 20 красавіка.

### Галерэя Ўнівэрсытэту культуры

Кастрычніцкая плошча, 1, тэл. 227-26-12, з 11 да 19.
Выстава творчай фатаграфіі «**Дэжа вю**». Да 14 красавіка.

### Гасьцёўня У.Галубка

вул.Старавіленская, 14, тэл. 286-74-03, 286-78-52.
**Беларусь на мапах гісторыі**. Да 50-годзьдзя ўступленьня Беларусі ў ЮНЭСКА. Мапы, атлясы тэрыторыяў Беларусі XVI—XX ст., гравюры ды інш. З 9 красавіка да 9 траўня.

### Гісторыка-культурны музэй-запаведнік «Заслаўе»

**Тры жыцьці дружыньніка**. Андрэй Вайцяховіч. Прадметы побыту дружыньнікаў X—XII ст. з раскопак. Да 1 ліпеня.

### ДК Трактарнага заводу

вул.Даўгабродзкая, 24, 4-ты паверх, з 10 да 19.
**Сакрэты анатоміі і чалавечага жыцьця**. Выстава васковых фігураў. Да 1 траўня.

### Дом культуры чыгуначнікаў

вул.Чкалава, 7, тэл. 225-37-70, з 10 да 19.
**Выстава свойскай жывёлы.** Да 31 траўня.

### Дом прыроды

вул.Багдановіча, 9а, тэл. 234-73-30, з 10 да 19, без выходных.
**Сьвет трапічных інсэктаў**. Да 30 траўня.

### Культурны цэнтар Беларускага фонду Рэрыхаў

вул.Русіянава, 9, тэл.260-22-20, з 10 да 18, сб, ндз. — да 16.
**Радасьць прыгажосьці**. Уладзімер Кіркевіч. Акварэль. Да 10 красавіка.

### Літаратурны музэй Янкі Купалы

вул.Янкі Купалы, 4, тэл. 227-78-66, з 10 да 17, без выходных.
**Народжаныя морам**. Выстава марскіх экспанатаў. Да 11 красавіка.

### Менскі абласны цэнтар народнай творчасьці

вул. Гікалы, 4, тэл. 239-06-60, з 10 да 19, вых. панядзелак.
**Маладачанская выцінанка**. Выстава выкладчыкаў і студэнтаў дэкаратыўнага аддзяленьня Маладачанскай музычнай вучэльні. У выходныя працуе майстар-кляса. Да 10 траўня.

### Музэй беларускай народнай творчасьці

спарткомплекс «Раўбічы», тэл. 507-44-68, з 10 да 17, вых. панядзелак, аўторак.
**Скура і пацеркі**. З фондаў Беларускага саюзу майстроў народнай творчасьці. Да 15 траўня.

### Музэй гісторыі беларускай літаратуры

вул. Багдановіча, 15, тэл. 234-72-61, 289-34-75, з 10 да 18, вых. панядзелак.
**Ад А да Я. З гісторыі лемантара.** Буквары XX—XXI ст., школьныя формы, прылады, падручнікі розных гадоў і інш. Да 1 траўня.

### Музэй гісторыі і культуры габрэяў Беларусі

вул. Харужай, 28, тэл. 286-79-33, 286-78-74, з 14 да 17, вых. субота, нядзеля.
**Менскае гета. Чалавек і лёс**. Фатаграфіі, дакумэнты. Да 1 чэрвеня.
**Уладзімер Мурахвер.** Жывапіс, прыкладное мастацтва. Да 20 чэрвеня.

### Музэй сучаснага выяўленчага мастацтва

пр.Скарыны, 47, тэл. 288-24-68, 284-86-21, з 11 да 19, вых. нядзеля, панядзелак.
**Кірус Авэрбэк. Графіка.** Да 12 красавіка.
**Супастаўленьне**. Канстанцін Селіханаў. Скульптура, графіка. Да 19 красавіка.

### Нацыянальны мастацкі музэй

вул.Леніна, 20, тэл. 227-45-62, з 11 да 18, вых. аўторак.
**Да колеру, сонца і паветра**. Да 100-годзьдзя аб'яднаньня «Саюз расейскіх мастакоў». Жывапіс, скульптура. Да 11 траўня.

### Нацыянальны музэй гісторыі і культуры

вул. Маркса, 12, тэл. 227-36-65, 227-43-22, з 11 да 18, вых. серада.
**Вобраз Божай Маці ў іканапісе**. Выстава Дзяржаўнага музэю гісторыі рэлігіі з Горадні. Да 4 траўня.

### Рэспубліканская навукова-тэхнічная бібліятэка

вул.Чырвонаармейская, 9, тэл. 26-18-40, з 10 да 19, вых. нядзеля.
**Прыгажосьць без падробак**. Навукова-тэхнічная літаратура, патэнтныя дакумэнты, каталёгі вядучых парфумэрных фірмаў. Да 9 красавіка.

## КАНЦЭРТЫ

**9 красавіка** (пт) — Фэст эстраднага танцу. (Тэатар эстрады.)

НЕДА і джаз-квартэт «Гіганты балтыйскага джазу» п/к Арта Анусаўскаса. (ДК прафсаюзаў.)

**9 красавіка** (пт) ў актавай залі філфаку БДУ (вул.Маркса, 31) адбудзецца канцэрт Алеся Камоцкага. Уваход вольны. Пачатак а 18-й.

## КІНААФІША

Рэпэртуар менскіх кінатэатраў з 9 да 11 красавіка

### «Аўрора» (253–33–60)

«Летуценьнікі»****: **9—11** (пт-ндз) 19.00, 21.10.
«Каханьне паводле правілаў... і без» («Оскар-2004»): **9—11** (пт-ндз) 16.20, 18.40, 20.50.
«Цяжкасьці перакладу» («Оскар-2004»): **9** (пт) 17.00, **10, 11** (сб, ндз) 15.00, 17.00.

### «Берасьце» (272–87–91)

«Кармэн»***: **9—11** (пт-ндз) 16.30, 21.00.
«Буйная рыба» («Оскар-2004»): **9** (пт) 18.45; **10, 11** (сб, ндз) 14.00 (іл), 18.45.

### «Кастрычнік» (232–93–25)

«Якім не шанцуе» (прэм'ера): **9** (пт) 15.00, 17.00, 19.00; **10, 11** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00.
«Монстар»**** («Оскар-2004», прэм'ера): **9—11** (пт-ндз) 21.00.

### «Масква» (223–27–10)

«Блубэры» (прэм'ера): **9** (пт) 17.00, 21.00; **3, 4** (сб, ндз) 14.40, 17.00, 21.00.
«Якім не шанцуе» (прэм'ера): **9** (пт) 19.20; **10** (сб) 13.00, 19.20; **11** (ндз) 13.00 (іл), 19.20.

### «Мір» (284–37–71)

«Амэрыканскі пірог-3: вясельле»: **9** (пт) 16.50 (іл) 21.10; **10, 11** (сб, ндз) 16.50, 21.10.
«Дом зь пяску і туману» («Оскар-2004»): **9—11** (пт-ндз) 18.50.

### «Перамога» (223–77–66)

«Заплямленая рэпутацыя»***: **9—11** (пт-ндз) 18.50, 21.10.
«Скарбы Амазонкі»: 9 (пт) 14.30, 16.40; **10, 11** (сб, ндз) 14.30 (іл), 16.40.

### «Піянер» (227–64–87)

«Дзюплекс»: **9** (пт) 14.00, 18.20; **10, 11** (сб, ндз) 18.20.
«Дрэнныя хлопцы-2»: **9** (пт) 20.50; **10, 11** (сб, ндз) 15.50, 20.50.

### «Цэнтральны» (220–34–16)

«Бабуся» (прэм'ера): **9** (пт) 11.00, 15.30; **10, 11** (сб, ндз) 11.00 (іл), 15.30.
«Каханьне паводле правілаў... і без» («Оскар-2004»): **9—11** (пт-ндз) 13.00, 17.30, 20.00.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

**Юнаму гледачу:**

**«Аўрора»**
«Блізард»: **9—11** (пт-ндз) 14.20.
**«Берасьце»**
«Навагодні паштальён»: **10, 11** (сб, ндз) 12.00.
**«Мір»**
«У пошуках Нэма»: **9** (пт) 15.00; **10, 11** (сб, ндз) 13.00, 15.00.
**«Піянер»**
«Кевін у краіне Драконаў»: **9** (пт) 12.00; **10, 11** (сб, ндз) 10.30, 14.00.
«Маладыя гады каралевы»: **9** (пт) 16.00.
«Богус»: **10, 11** (сб, ндз) 12.00.

Альгерд Бахарэвіч

# Віялета



На ёй была кароткая жоўтая сукенка, пад сукенкай — толькі вяршкі празрыстых стрынгаў, на плячы вісела маленькая, амаль пустая кайстрачка. Доўгія русыя валасы і небясьпечна адкрытыя ногі сеялі за сьпінай сьмерць і руйнаваньне.



так раззлавалася што нават забылася выняць тэлефонную картку зрабіла камусьці падарунак невялікая страта ды якое яны права маюць са мной размаўляць такім тонам і яшчэ гэты цюхля абцас трэснуў зьняла лёгка пайшла басанож кінула туфляй у дворніка злавіла сукенку на жываце вольная гэта ёй пасыгналілі вунь з таго опэля а зашыпелі як мярзотна кыс кыс кыс мудакі! дарослая не яшчэ а ўжо: а ідзіце вы ўсе! я жыць хачу

Стаяла лета, і яе звалі Віялетай — рыфма спрыяла легкадумнасьці. Кароткай маўклівай гутаркі зь несапсаванай тытунём цыгарэтай ёй хапіла, каб завяршыць укладку думак у галаве — больш формы, больш аб’ёму. Віта выкінула недапалак і агледзелася вакол. Яе прыціскала да грудзей бліскучая грамадзіна вакзалу, гадзіньнік на вежы паказваў 9.29. Было сонечна й халаднавата, і людзі плавалі ў гэтым тэмпэратурным кактэйлі. Некалькі хвілінаў яна вывучала свой адбітак у люстраным акне: яна была высокай, аднаго росту з большасьцю навакольных мужчын, на ёй была кароткая жоўтая сукенка, пад сукенкай — толькі вяршкі празрыстых стрынгаў, на плячы вісела маленькая, амаль пустая кайстрачка. Доўгія русыя валасы і небясьпечна адкрытыя ногі сеялі за сьпінай сьмерць і руйнаваньне. Прынамсі, Віта на гэта спадзявалася. Што ж, улічваючы тое, як таропка яна выскачыла з кватэры, выглядала Віта зусім няблага. Тут яна заўважыла, як па той бок шкла, за некалькі, па сутнасьці, сантымэтраў, за ёй назірае нехта недагледжаны, нізенькі, пляшывенькі — Віта аблізнулася яму, і ён пасьпешліва адвярнуўся. Яна з пачуцьцём уласнае перавагі абвяла вачыма сьвет і вырашыла зайсьці.

Тут, натуральна, пачалося. «Дзяўчына, зьмерзьнеце, прастынеце, давайце я вас на руках аднясу!» Яшчэ чаго. Віта пастаяла, задраўшы галаву, перад раскладам: нічога цікавага, усялякія Ніжнявартаўскі ды Псковы. «Сонейка, ножкам ня хо?» Яна паднялася ў бар, замовіла кавы, не дачакалася, накіравалася ў залю чаканьня, потым паднялася на апошні паверх. Яе свабода патрабавала выхаду. Вось зараз яна праводзіць парачку цягнікоў, а потым басанож у мэтро, да Сьветкі. Бездапаможная... Гэта ж трэба такое пра яе сказаць. Віта ўявіла, як яе цела падае ўніз — атрымлівалася, што якраз на эскалятар, які зноў прывязе наверх. Яна спусьцілася да білетных касаў.

Разумным дзяўчынкам падабаецца назіраць за людзьмі. Віта любіла здагадвацца пра чалавечыя фобіі. Вось той, нізенькі, пляшывенькі, чаго ён баіцца? Відаць, больш за ўсё — сэксуальных паразаў, а яшчэ — згубіць працу й забыцца перад выхадам на вуліцу зашпіліць прарэх. А тыя хлопцы ў «опэлі»? Ну, тыя, відаць, жабрацтва. І яшчэ сваіх паміраючых мамаў, якія ніяк не памруць. Яна паглядзела на зачыненае акенца адной з касаў. Ля яго стаяў няголены, насаты, плячысты прыгажун у чорнай майцы і маркотна калупаўся ў роце зубачысткай. У. Пра гэтага так адразу й ня скажаш. Калі такі й спалохаецца чаго, то адразу ж са страху сатрэ небясьпеку ў пральны парашок. Ля ног насатага прыгажуна, як нямецкая аўчарка, ляжала вялікая, пародзістая, мускулістая спартовая торба. А ў ёй што?.. Два кіляграмы трацілу, ды Каран, ды ятаган.

— Дэвушка, — насаты прамяніста, белазуба пасьміхнуўся і тут жа самкнуў вусны, насьцярожана аглядзеўся вакол. Віта застыла на месцы. Аднак прыгажун ізноў усьміхнуўся:

— Паехалі са мной на Югу. У мяне два квіткі, а я, як бачыш, адын.

Ён што, думае, я спалохаюся й пабягу прэч? Віта, папраўдзе, насамрэч адчула ў жываце нешта дзіўнае, нядобрае такое, цеснае… і імгненна інстынкт самазахаваньня запёк у горле... чаму ў горле? Нагам раптоўна стала халодна, як калі б над горадам ні з таго ні зь сяго загулі бамбавікі Сьнежнай Каралевы. Віта паглядзела на вакзальную мітусьню, якая стала нечакана такой далёкай, нерэальнай, нібы намаляванай, і ў той жа час — вось ужо ніколі не падумала б — такой кранальна-роднай, і ўласная сукенка падалася ёй празрыстай.

— Паехалі, — прамовіў насаты ўжо больш абыякава й зноў сунуў зубачыстку ў рот. — Босымі нагамі трэба па гарачым пясочку хадзіць, а не...

— Паехалі, — Віта зірнула на яго з выклікам, хоць унутры яе не было нічога, апрача цьмянага жаху. — Чаму б і не?

Ён падхапіў торбу, кінуў нешта пра пяць хвілінаў, і яна пакрочыла побач, намагаючыся выглядаць як мага больш разьняволенай і незалежнай. Насустрач прайшоў малады міліцыянт, мімаходзь ацаніў ногі, параўняўся зь імі, зьнік за сьпінай. Як апошняя надзея, зьлева зьявіўся, кінуўшыся наперарэз позірку Віты, строгі крыжык у літары «Ж» на маленькіх дзьвярох. Паціраючы рукі, з прыбіральні выйшла мажная цётка з фальшывымі каралямі на мокрай шыі, агідная цётка, шкодная распуслая цётка, — але цяпер Віта гатовая была кінуцца ёй на шыю й прасіць абароны. «Я на адзін сэк», — прамармытала яна, вінавата ўсьміхнулася насатаму і ў думках схапілася за галаву: паводжу сябе, як падлетак. Віта сунула ў акенца апошнюю дробязь. Будзем спадзявацца, што тут чыста. Падлога нейкая ліпучая, і скразьняк. Кафля белая, задубелая, хваравітыя бальнічныя адчуваньні... Акно адчыненае, за некалькі крокаў ад акна, якраз на мяжы засьмечанай травы і асфальту, сканчаецца цень, і далей — сонца, вецер, гарадзкі шум. Можа, уцячы, ад граху далей, пакуль ня позна? Усе кабінкі вольныя, дзьверы парыпваюць. Віта падышла да люстра. На яе глядзела спалоханае дзіця, якому, здавалася, імгненьне таму далі аплявуху. Бразгат за сьпінай прымусіў яе здрыгануцца — зьніадкуль узьніклая прыбіральшчыца грымнула вядром і пачала душыць мокрую анучу. Віялета ў думках перахрысьцілася, павярнулася да выхаду, зрабіла няўклюдны крок наперад і ледзь не наступіла на маленькі чорны пэйджэр.

«Цяпер я разумею, чаму Сьветка называе мяне клептаманкай», — разгублена думала яна, на хаду запіхваючы знаходку ў сваю кайстрачку. «Пэйджэр. Чый? Ня можа быць, каб гэтай старой прыбіральшчыцы. Няўжо імі яшчэ нехта карыстаецца? І нашто ён мне?» Віта з сумам згадала пра свой навюткі мабільнік, які ляжаў у гэтыя хвіліны дома, зараджаўся, абяцаючы такое зіхоткае жыцьцё, спакойнае сёньня, радаснае заўтра. Пэйджэр. Састарэлая цацка.

Яна выйшла, цешачы сябе надзеяй, што насаты зьнік, не дачакаўшы, аднак той быў на месцы, стаяў у звыклай сваёй позе, прываліўшыся да сьцяны, каўкаскі мача, страшны й прыцягальны адначасова. Падарыў ёй чарговую ўсьмешачку, дакрануўся лёганька да рукі: хадзем. Праз хвіліну ён ужо дапамагаў Віце ўзабрацца ў вагон, і неўзабаве яна амаль абыякава назірала, як, хістаючыся ад ранішняга пахмельля, то наганяючы цягнік, то ўсё адчайней адстаючы, побач з акном бяжыць яе горад. Калі цягнік вырваўся нарэшце на волю, яны пазнаёміліся. Насатага звалі Муратам, больш ён пра сябе нічога распавядаць ня стаў. Запытальна паглядзеўшы на Віту, прапанаваў ёй халодны хот-дог і, атрымаўшы яе надзіва рэзкую адмову, пацісьнуў плячыма й залез на верхнюю паліцу.

Гэта было цудам, але ў купэ, апрача іх, нікога не было. Віта сядзела ўнізе, у нейкім здранцьвеньні, потым забралася на сваё месца з нагамі, адкрыла кайстрачку, дастала пэйджэр, пакруціла яго ў руках. Мурат ляжаў нерухома, можа быць, заснуў — мала якія справы маглі быць уначы ў чалавека з такім носам і такой торбай. За акном беглі лясы. Завітала правадніца, і зьверху, па-над Вітай, раптам зьявілася валасатая рука, аддала квіткі, заплаціла за бялізну. Віта хацела ўжо схаваць пэйджэр і паспрабаваць пагаварыць са сваім насатым спадарожнікам, ды пякельная машынка на яе далоні нечакана прапішчала й выдала нешта неймавернае.

«Прывітаньне, Віялета!» Гэта было ўжо занадта для адной раніцы. Мы, значыцца, яшчэ і знаёмыя з табой, а, пэйджэрчык? Віту гэтае фантастычнае пасланьне агаломшыла, але й трохі супакоіла. Яна, нягледзячы на ўсё вар’яцтва сытуацыі, адчула, і ад гэтага да шчокаў прыемна прыліла кроў, што не адна ў гэтым цягніку, які вязе яе невядома куды, невядома да чаго, невядома з кім. Так ці інакш, Віта паглядзела на пэйджэр




бадай зь пяшчотай.

«Я ў тамбур», — сказала яна на ўсялякі выпадак у кірунку верхняй паліцы й, не атрымаўшы адказу, выйшла. У праходзе ля акна стаяў рамантычнага выгляду малады чалавек. «Гэты, відаць, баіцца, што маці засьпее яго калі-небудзь за рукаблудам», — падумала яна весела, наўмысна пацерлася, праходзячы міма, аб маладога чалавека сьпінай і выйшла ў тамбур. Там правадніца ачышчала попельніцу. «Сын у войска йдзе — вось жах!» — адзначыла машынальна Віта, дачакалася, пакуль застанецца адна, і дастала пэйджэр ізноў. Ён і на гэты раз ня стаў маўчаць. «Зайдзі ў першае купэ і атрымай падарунак» — паведаміла яе загадкавая знаходка, зусім як у якім-небудзь кампутарным квэсьце. Ня доўга думаючы, Віта цьвёрдым крокам прайшла куды было загадана. Малады чалавек абярнуўся ёй усьлед. Першае купэ, куды яна асьцярожна зазірнула, было абсалютна пустым, толькі на століку прыемна пукаціўся невялікі пакет. Віта разгарнула яго і знайшла ўнушальны пачак грошай ды новыя пантофлі, якія (яна ўжо нават не зьдзівілася) цудоўна пасавалі да яе сукенкі. Слова было за пэйджэрам. «Ты такая прыгожая» — адгукнуўся ён сьціпла й згас.

У цёмным кутку праходу Віта зноў сутыкнулася з правадніцай. Тая паглядзела падазрона, настолькі падазрона, што Віта на момант замарудзілася і правадніца здолела пачаць гаворку.

— Гэта з вамі ў купэ хто? — на бляклых гузіках форменнага адзеньня правадніцы зайграла выпадковае сонца.

— Муж, — коратка кінула Віта й рванулася наперад.

— Грузін? Чачэн?

— Ня вашая справа, — Віта праціснулася да свайго купэ й кінула пераможны позірк на верхнюю паліцу. Зь яе бесклапотна зьвісала валасатая смуглявая рука.

Апоўдні, калі цягнік стаяў у нейкім памежным мястэчку, Мурат нарэшце спусьціўся й прапанаваў прабегчыся разам па прыстанцыйнай плошчы, набыць ёй абутак і ўсё неабходнае. Віта зь вясёлай пыхлівасьцю адмовілася й сама прапанавала свайму спадарожніку грошай. Пантофлі Мурат, безумоўна, заўважыў, але зрабіў выгляд, што іх зьяўленьне яго зусім не зьдзівіла. А добрыя ж пантофлі. Натуральная скура. Яны пагаварылі крыху ні пра што, кароткімі, таннымі сказамі. У купэ было душна. Нарэшце цягнік здрыгануўся й рушыў далей.

Увечары да іх завітаў той самы рамантычнага выгляду, але надта ўжо вузкаплечы хлопец, завітаў папрасіць вады, бо маме (ага, ён яшчэ й вандруе з мамаю!) стала блага і няма чым запіць пігулкі. Мурат, які якраз наталяўся банакваю проста з рыльца, працягнуў бутэльку.

— Не, — схамянуўся хлопец, сустрэўшыся з Муратам вачыма. У позірку вузкаплечага Віта заўважыла нешта падобнае на гідлівасьць. — Не, дзякуй. Я... Я ў правадніцы лепш...

Хлопец паглядзеў на Віту з дрэнна схаваным асуджэньнем, потым, быццам аслупянеўшы, моўчкі перавёў погляд на Мурата. Доўга, ненатуральна доўга мужчыны глядзелі адзін на аднаго, і Віце хацелася топнуць нагой, замахаць рукамі, крыкнуць што-небудзь, толькі б скончылася гэтая невыносная паўза.

— Вазьмі, — напружана засьмяяўся Мурат, не адводзячы вачэй. — СНІД празь сьліну не перадаецца.

Хлопец разьвярнуўся й выйшаў. Працягнутая рука Мурата з бутэлькай засталася на некалькі імгненьняў вісець у паветры, і Віта, падпарадкоўваючыся загадкаваму для яе самой парываньню, ударыла па гэтай руцэ, і вада вылілася, і трапіла на распакаваную бялізну. Мурат пацісьнуў плячыма й палез на сваю паліцу.

Між тым непрыкметна надышоў вечар. Яны моўчкі павячэралі Муратавымі хот-догамі. Цягнік зрабіў яшчэ некалькі прыпынкаў, але ў купэ да іх так ніхто й не падсеў. Віту турбавалі два пытаньні: ці будзе насаты прыставаць да яе ўначы й ці пойдуць у яе заўтра месячныя. Што да першага, то, натуральна, гэта было непажадана, але, з другога боку, як гэта — не прыставаць, яно ж неяк нецікава выходзіць. Што да другога, то гэта стварала ў цягніку масу праблемаў. Віта зрабіла некалькі вылазак у тамбур. Пэйджэр за гэты час ні разу не падаў голасу і, толькі калі за вокнамі сьцямнела, нарэшце загаварыў. «Ты гатовая аддзячыць?» Віялета доўга разважала над сэнсам пасланьня, але ні да якай высновы не прыйшла.

— Ты як, храпеш? — спытала яна, сьцелячы бялізну. За дзьвярыма пасажыры маленькімі статкамі бегалі ў прыбіральню й назад. Пэйджэр мігцеў, высунуўшыся з напаўадчыненай кайстрачкі.

— Сапраўдны мужчына храпе толькі пасьля таго, як давядзе, што ён сапраўдны мужчына, — падміргнуў Мурат і, аднак жа, палез наверх. Віта пасьпела заўважыць, як ён абмацвае сваю торбу. Чарговы раз выйшла ў тамбур. Мужык, якога яна дагэтуль ня бачыла, пачаставаў яе цыгарэтай. Віта павярнулася да акна.

— Што, у азэраў ужо грошай няма на курава? — выразна прамовіў мужык. Нехта так ляпнуў дзьвярыма прыбіральні, што ў супрацьлеглым канцы вагона загаласіла праваднiца. Віта нэрвова павяла плячом. Мужык падышоў да яе ззаду й прыцягнуў да сябе.

— Э, пасьцілка... — зашаптаў ён горача, насьліньваючы ёй мочку вуха. — Давай...

Віта вырвалася; зрэшты, мужык ня стаў яе затрымліваць і тут жа павярнуўся да таго акна, у якое яшчэ нядаўна так інтэлігентна ўзіраўся. Яна хутка перайшла ў другі тамбур і там, з агідаю чэшучы вуха, прачытала наступнае пасланьне. «Забі чурку».

Душа патрабавала яшчэ адной цыгарэты, аднак яна пайшла ў купэ. Мурат ня толькі хроп, як трактар, ён яшчэ й стагнаў у сьне, па-сабачаму так, задыхаючыся. Віта легла не распранаючыся й узяла пэйджэр у руку. На пэўны момант ёй падалося, што яна задрамала, — высьветлілася, што ўжо палова на шостую і яна праспала амаль усю ноч. Храп наверсе быў цяпер роўны, і нішто не замінала перавярнуцца на другі бок ды заснуць. Аднак пэйджэр толькі й чакаў ейнага абуджэньня. На гэты раз ён завібраваў, з мужчынскай жарсьцю, вырываючыся з рук. «Забі чурку». Віта расьціснула пальцы, і пэйджэр упаў на падлогу. «Няхай», — падумала яна млява й зноў прывалілася ў сон. Прачнулася яна ці то таму, што цягнік ізноў спыніўся, ці то ад ціхага віску пякельнай машынкі, што ляжала ў яе на грудзёх. «Забі чурку». Віта паднялася, расправіла сукенку, выйшла ў калідор. Цягнік стаяў пасярод стэпу, ля нейкай маленькай вёскі, якая, мяркуючы па ўказальніку, так і называлася: Чыгуначная. На дзьвярах купэ была прыклееная жоўтым скотчам паперка. Віта, мружачыся ад ранішняга сонца, прачытала й, пахіснуўшыся, вярнулася ў купэ. «Забі чурку». Яна ўзяла падушку й салодка пазяхнула.



ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

# Плітка



Людка Сільнова

Сыходзіць з вуліцаў сьнег — і агаляе плітку. Вясна!.. Застукалі абцасы: цок-цок! цок-цок! — жаночыя, мужчынскія — па тратуарнай плітцы.

Плітка падала голас і заявіла пра сваё існаваньне. Яна — сьветлая, гладкая, сыстэмна ўкладзеная. Яна зусім не падобная да шурпатага асфальту, які ляжаў тут нядаўна. Да тае невыразнае, застылае, шэрае масы. Матэрыялу, які атрымліваецца ўшчыльненьнем у гарачым стане сумесі пяску, друзу, бітуму.

Было гэтае старое асфальтавае пакрыцьцё ўсё ў «лапіках» пэрманэнтнага рамонту, у трэшчынах ды ямках з жоўтым пясочкам...

Мы — дзеці асфальту: аднапартыйнасьці, аднадушша, гарачага нівэляваньня сьвядомасьці.

У эўрапейскіх гарадах здаўна была распаўсюджаная тратуарная плітка (раней камяні). Відаць, зь якіх часьцін складаецца гэтая дарога пад нагамі. Дарога, што, нібы рака, нясе людзкую плынь. З усімі чалавечымі марамі, клопатам, спадзяваньнямі.

Да таго ж, пашкоджаную плітку нашмат лягчэй рамантаваць. Ня трэба дыміць, сьмярдзець, тарахцець маторамі пад вокнамі. Плюшчыць той несумленны, «гарбаты» асфальт...

Калі прыгледзецца да новай пліткі на тратуарах сталічных вуліц, можна ўбачыць, што разам зь ёй многія набылі і свой непаўторны твар.

На праспэкце Скарыны кожная плітка нагадвае сваёй формаю літары ў наборы друкарскага варштату. Найбольш — знакавыя беларускія: І, І, І... Або вэртыкальныя элемэнты іншых літараў. (У спэцыялістаў гэты модуль пліткі завецца «катушкамі». О, намотвайцеся на іх, тыя мільёны «катушак», нябачныя ніці нашай гісторыі!..)

Плітка ўздоўж агароджы, ля былых партыйных трыбунаў, падобная да прастакутнікаў-пагонаў. Мо таму, што побач на горцы знаходзіцца Дом афіцэраў, пляц перад якім здаўна выкладзены падоўжанымі шэрымі прастакутнікамі, толькі нашмат большымі. Роўнымі, шчыльнымі радамі... Як на аглядзе ці парадзе! Праўда, гэта месца выкарыстоўваецца ў асноўным як стаянка для машын і аўтобусаў.

З пляцам кантрастуе какетлівы Цэнтральны сквэр з новым цёмнаружовым пакрыцьцём дарожак. Гэткія дарожкі-панчошкі!

На плошчы Незалежнасьці новая плітка белая, чорная, чырвоная, шэрая. Будынак Менгарсавету нібы закінуў невад у людзкое мора і хоча вылавіць сабе наведнікаў: скаржнікаў ці прафэсіяналаў («залатых рыбак»), неабыякавых да лёсу гораду. А можа, гэта бачны кавалак дзяржаўнага штурвала?..

Калі іду па сваім двары, адмысловай дарожкай ля пад'ездаў, звонка адгукаецца пад абцасамі новая плітка. Маленькія «акенцы», закручаныя леташнімі майстрамі дарог у старыя, як сьвет, салярныя знакі. Viva la vita!..

Вось што распавяла мне пра нас плітка.

БІБЛІЯТЭКА ЛЯВОНА БАРШЧЭЎСКАГА

# Ромы і мы




**Фрэйзэр А. Цыганы.** — Менск: «Тэхналёгія», 2003

У сваім лісьце, адрасаваным Беларускаму ПЭН-Цэнтру, актывіст цыганскага руху, юрыст Мікалай Калінін (сын беларуска-цыганскага паэта Вальдэмара Калініна) зьвяртае ўвагу на дыскрымінацыю цыганоў ва ўсіх сфэрах публічнага жыцьця Беларусі й адзначае, што ва ўсёй краіне «на сёньняшні дзень няма ніводнай дзяржаўнай праграмы, скіраванай на разьвязаньне цыганскіх праблемаў». Цыганы здаўна ёсьць «забытым народам», і толькі параўнальна нядаўна зьявіліся рэальныя праграмы падтрымкі развіцьця цыганскай («рома») культуры ў шэрагу краін Эўразьвязу — перадусім яго новых чальцоў (Чэхія, Славаччына, Вугоршчына). Адной з прычынаў паўсталай сытуацыі ёсьць абсалютнае няведаньне культурна-гістарычных каранёў і асаблівасьцяў існаваньня цыганскага народу ў прасторы й часе. Гэты прабел істотным чынам можа запоўніць капітальная праца Ангуса Фрэйзэра.

Сэр Фрэйзэр, колішні дарадца брытанскага ўраду ў справах эфэктыўнай арганізацыі працы, усе свае навуковыя зацікаўленьні скіраваў на вывучэньне гісторыі й культуры цыганскага народу. Выкарыстоўваючы гістарычна-культурныя, антрапалягічныя і лінгвістычныя аргумэнты, ён дае падрабязны агляд гісторыі цыганоў. Аўтарскі погляд напачатку скіраваны на індыйскі пэрыяд гуртаваньня продкаў сёньняшніх цыганоў, пасьля дэталёва разглядаюцца шляхі іх пазьнейшых міграцыяў (Пэрсія, Арменія, Бізантыя і Грэцыя, Сэрбія, Баўгарыя, Валошчына, Малдавія, краіны Заходняй Эўропы, Вугоршчына, Трансыльванія).

Асобны разьдзел прысьвечаны «забытаму галакосту». Гэтае слова асацыюецца ў нас толькі з масавым вынішчэньнем габрэяў, а пра тое, што аналягічны лёс напаткаў цыганоў, часьцяком забываецца. Між тым толькі ў Асьвенцыме з 23 тысячаў загнаных туды цыганоў было зьнішчана больш за 20 тысячаў...

Выданьне суправаджаецца капітальнай бібліяграфіяй. Да гонару выдавецтва трэба адзначыць, што ў бібліяграфіі таксама зьмешчаны дадатак — «Літаратура пра цыганоў у Беларусі».

Кнігу «Цыганы» пераклаў Антось Кузьміч, гадаванец Беларускага ліцэю й аддзелу клясычнае філялёгіі Люблінскага ўнівэрсытэту, колішні супрацоўнік «НН».

**Лявон Баршчэўскі**

# Фралова — у БНФ, Шалкевіча — на Ямайку

## Гіт–парад першакрасавіцкіх жартаў

### БНФ — партыя генэралаў

З раніцы прэс-служба БНФ парадавала навіною аб тым, што генэрал Фралоў падаў заяву аб уступленьне ў партыю. «Такім чынам Партыя БНФ атрымала ўласнае прадстаўніцтва ў нацыянальным сходзе», — мройна адзначаецца ў заяве. «Я абраў менавіта БНФ па той прычыне, што яна пасьлядоўна на працягу апошніх 15 год бароніць ідэі беларускай дзяржаўнасьці і незалежнасьці. Я па натуры патрыёт беларускай дзяржавы, якім і мае быць сапраўдны вайсковец, таму я вырашыў далучыцца менавіта да БНФ», — цытавала генэрала прэс-служба. Вінцук Вячорка ў сваім камэнтары назваў рашэньне генэрала «адзіным правільным крокам» і абяцаў цягам пяці дзён выпісаць яму сяброўскае пасьведчаньне. Пакуль жартаўнікі пасьпелі перапрасіцца за першакрасавіцкую інфармацыю, журналісты ледзь не абарвалі тэлефон Управы партыі. Ці выжыў генэралаў мабільнік — невядома.

### Шкілеты клясыкаў

Заходнія газэты дбаюць, каб паведамленьне глядзелася праўдападобным, не банальным. Паважная «Gazeta Wyborcza» паведаміла навуковую сэнсацыю! Генэтыкі адкрылі, што шкілет Пэтраркі мае правую руку Адама Міцкевіча. Мабыць, шкілет Адама Міцкевіча мае руку Пэтраркі? І далей — грунтоўнае дасьледаваньне на тэму, хто, калі й навошта мог тыя рукі замяніць.

### Шалкевіч і растафары

Газэта «Дзень», чыста гарадзенскі жарт: Шалкевіча запрасілі з канцэртам на Ямайку. Камэнтар быў у духу дысцыплінарнае дырэктывы: Шалкевіч абавязаны ўзяць афіцыйны дазвол на гастролі ва Ўпраўленьні культуры Гарадзенскага аблвыканкаму і адпачынак за ўласны кошт у Тэатры лялек. «Віктар адмовіўся камэнтаваць «Дню» свой хуткі вылет на Ямайку, паабяцаўшы даць эксклюзіўнае інтэрвію газэце «Вечерний Гродно», якую выпісвае зь першага нумару».

### Безалькагольная гарэлка

Сталічная «вячорка» пацешыла барадатым жартам пра безалькагольную гарэлку, якую нібыта пачаў вырабляць «Крышталь». Смак той самы, а эфэкту — нуль.

### Партрэт самы настаяшчы

У Дзень дурня ля менскай Камароўкі прайшла акцыя «Партрэт прэзыдэнта ў кожную хату». Маладыя апазыцыянэры з групы «Лімон» каяліся, прызнавалі памылкі мінулага й раздавалі мінакам партрэты Гаранта Канстытуцыі. Прычым запэўнівалі ў лекавых уласьцівасьцях выяваў. Адно не дэманстравалі, як прыкладаць партрэт да хворага месца, каб не правакаваць міліцыю. Людзі рагаталі. Міліцыя нікога не затрымала!

### Расейцам баліць язык

«Известия»: у Гаазе адбылася сустрэча прэзыдэнтаў Расеі Пуціна і Эстоніі Руйтэля. Былому кагэбісту ўдалося дабіцца ад былога першага сакратара Кампартыі згоды на прызнаньне расейскае мовы другою дзяржаўнаю ў Эстоніі.

### Зімоўскі прабачыўся

«Народная воля», якая летась на Дзень дурня паведаміла пра прылёт Хусэйна ў «Менск-2», чым зарабіла папярэджаньне Пракуратуры, сёлета жартавала асьцярожна і ідэалягічна вытрымана. На першай старонцы зьявіўся артыкул пра стварэньне Міністэрства прапаганды й засваеньня ідэалёгіі, кіраўніком якога прызначаны Аляксандар Зімоўскі. Намесьнікам «НВ» «прызначыла» Яўгена Новікава, які на наступны дзень атрымаў вельмі нежартоўную ноту пратэсту ад французскага ды польскага паслоў. У тым самым паведамленьні значылася, што Зімоўскі сабраў апазыцыйныя палітыкаў ды перапрасіў за «кампанію шальмаваньня». Цэнтравы жарт матэрыялу: Беларусь усё ж не пакідае спадзяваньня на лепшае.

**Сяргей Мікулевіч**

• СКАНВОРД •




**Склаў Вожык**

## Вынікі конкурсу маладых літаратараў імя Пэтраркі

Па выніках абмеркаваньня твораў, дасланых на конкурс, журы Беларускага ПЭН-Цэнтру вырашыла абвясьціць пераможцамі першага туру наступных асобаў: Анікіевіч Вольгу, Бурага Яўгена, Вішнявецкую Кацярыну, Вялес Кацярыну, Каляду Югасю, Квіткевіча Алеся, Квяткоўскую Касю, Лабадзенку Глеба, Лянкевіча Ўладзімера, Марголь Кацярыну, Марозаву Вольгу, Мартысевіч Марыю, Пачкоўскую Віялету, Сьвярдлова Паўла, Цемрыка Велета, Шастак Юлію, Юдзіну Настасьсю. Гэтыя маладыя аўтары будуць запрошаныя на майстар-клясы, што адбудуцца з 29 красавіка да 2 траўня.

Дзякуй групе моладзі
зь Берасьця «Краявід», якая падпісала
на «НН» 5 адрасатаў.

### УДАКЛАДНЕНЬНІ

**Мікрафон**

У «НН» № 13, у артыкуле «Каханьне паводле правілаў... і без», замест «Асаблівую «падзяку» трэба выказаць мясцовым пракатчыкам за беспрытульны мікрафон у кадрах» трэба чытаць «Асаблівую «падзяку» трэба выказаць апэратару й гукаапэратару карціны за беспрытульны мікрафон у кадрах».

**Цана за візы**

У паведамленьні «Візы таньнеюць» у №13 трэба чытаць: «візы… будуць каштаваць 6 даляраў (аднаразовая) і 30 даляраў (шматразовая)».

**Хроніка апазыцыі**

Зьміцер Тычына, Андрэй Лапановіч, Ігар Казакоў з Салігорску — актывісты не ПБНФ, а КХП-БНФ. Перапрашаем за блытаніну.

### Адказы на крыжаванку, зьмешчаную ў №13.

**Па гарызанталі:** 7. Палундра. 8. Пераклад. 11. Банан. 12. Крылы. 13. Цыплакова. 16. Пілётка. 17. Дружбак. 18. Довад. 20. Палена. 21. Замова. 22. Качаня. 23. Мамант. 25. Рамка. 29. Каўбаса. 31. Алейная. 33. Сапліцова. 35. Яшчур. 36. Баран. 37. Анісаўка. 38. Гарлапан.

**Па вертыкалі:** 1. Маладзік. 2. Бурак. 3. Дружына. 4. Перавод. 5. Скура. 6. Падлетак. 9. Суліко. 10. Сакура. 14. Сталічная. 15. Суворавец. 18. Даляр. 19. Дзіма. 24. Канюшына. 26. Апілкі. 27. Клёцкі. 28. Палтаран. 30. Арабіка. 31. Адвакат. 32. Бутсы. 34. Тарас.

### ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Віталю Я. зь Віцебску.** Абіраючы для апавяданьня «вечны сюжэт», варта ўкладаць у яго максімум свайго. Гэтага «свайго» ў Вашым творы не стае.

**Алегу З. зь Менску.** Цяжка напісаць аб'ектыўна пра любімы гурт. Эмоцыі дамінуюць над аналізам. Паспрабуйце адрэцэнзаваць яшчэ які музычны альбом — толькі з новых! Калі цягне пісаць, спрабуйце сябе ў іншых формах, ня толькі рэцэнзіях.

### • ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ •

**ВІТАНЬНІ**

**Наста І.** зь Берасьця, вялікі дзякуй за інфармацыйную падтрымку і дапамогу. Антон Б., Ігар К.

**У Дзень народзінаў** зычу Ўладзімеру Аляксандраву меней сатыры і фантазіяў. Джонатан Сьвіфт

**Уладзе!** Перадаём віншаваньні ад Сафокла (Вы чытаеце па-старагрэцку?) і запрашаем на смажаную качку. Мы з Мартай

**КАНТАКТЫ**

**Ад Вас, адзінага,** 25-ю вясну чакае ліста ў старажытнай сталіцы Вялікага княства Літоўскага шаноўная пані. А/с 1, 231244. Наваградак

**Мянчук** (42/170/54) з в/а, бяз шк/зв, пазнаёміцца з жанчынай для стварэньня сям'і. а/с 6, 220012, Менск

**Ты ўжо сказаў** сваёй маці «вялікі дзякуй» ад майго імя?

**ПРЭЗЭНТАЦЫЯ**

**15 красавіка** а 16-й у Лекцыйнай залі Нацыянальнай бібліятэкі адбудзецца прэзэнтацыя энцыкляпэдычнага слоўніка «Беларуская міталёгія»

**КНІГІ**

**У Пінску** цяпер можна замовіць беларускія кнігі. Даведкі праз т.: 8-029-653-69-35. Яўген

**Рэдкія ды новыя кнігі**, часопісы, падручнікі, слоўнікі, дапаможнікі, календары, значкі, майкі, кераміка, аўдыё, відэа, CD на Румянцава, 13 (ТБМ), ля Лінгвістычнага ўнівэрсытэту. 13.00—19.40, апроч выходных

**«Навінкі-magazine»** поштай! Замовы дасылаць на mail: alegmzr@tut.by

**Шукаю кнігу** «Берасьцейшчына» з сэрыі «Мой родны кут», набуду ці зьмяняю. Т.: 221-21-81. Слава

**Кнігу Жанны Эрш** «Філязофскае здумленьне» («ЭўраФорум», 1996) набуду. Т.: 238-95-96. Тацяна

**Набуду** якую кніжку Алеся Разанава. 205-97-72. Аляксандар

**Набуду** літоўска-расейскі слоўнік і падручнікі на літоўскай мове. 8-029-763-75-03

**Прадам ці абмяняю** Беларускую Энцыкляпэдыю (т. 3, 7—10), «Беларуска-расейскі слоўнік» Байкова і Некрашэвіча, энцыкляпэдычны даведнік «Архітэктура Беларусі», «Гісторыю Беларусі» Доўнар-Запольскага, «Живописную Россию» Кіркора, «Слоўнік іншамоўных слоў» Булыкі ў дзьвюх частках. Т.: 230-91-53

**Прадам** «Этымалягічны слоўнік беларускай мовы» (т. 1—4, 8), «Дзяды» А.Міцкевіча, «Большую Советскую Энциклопедию» ў 30 тамах (трэцяе выданьне), «Вандроўкі па маіх былых ваколіцах» У. Сыракомлі, «Старажытную Беларусь» Ермаловіча. Т.: 230-91-53

**«Нарыс гісторыі Беларусі»** Захара Шыбекі ды іншыя цікавыя кнігі на Румянцава, 13 (ТБМ) у будні (13.00—19.40.), на Купалы, 27 (кірмаш «БелЭкспа») штосуботы (10.30—15.30)

**РАСЬЛІНЫ**

**Танна прадам** фіялкі ды некаторыя іншыя расьліны (кітайскую ружу, кактусы і г.д.). Т.: 221-21-81. Слава

**Таматаў саджанцы** прадам. Сорт «Смарагд» (цёмна-зялёныя). Т.: 221-21-81. Слава

**МАЙСТАР-КЛЯСА**

**Алесь Сапега**, майстар-кляса «Пасьвячэньне ў барабаншчыкі», 12 красавіка, Акадэмія музыкі (вул.Чычэрына, 5), 17.00. Удзельнічаюць «Яблычная гарбата», «Фэстываль». Уваход вольны

**ПРАЦА**

**Дадатковы заробак**. Тэлефанаваць з 15-й да 21-й. Т.: 230-06-85. Труханoвіч Тацяна

**Запрашаю да супрацы** ініцыятыўных разумных беларусаў. Т.: 8-029-766-12-79. Зьмітрусь

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай мове, гісторыі і літаратуры. Зьвяртацца загадзя. Т.: 235-18-72 пасьля 17.00. Юрась

**КАЛЕКЦЫІ**

**Прадам аўтографы** П.Паўлава і А.Кулінковіча (ксэракопіі). Вул.Фёдарава, 13/1-14, 220019, Менск. Зайцу Алегу

**Узнагароды** БНР, БЦР, БКА, ген.Булак-Балаховіча, манэты ВКЛ, Рэчы Паспалітай. Войслаў Люты, Т.: 8-029-722-46-04

Запрашаем на падарожжа **18 красавіка** (нядзеля) па маршруце **Менск — Глыбокае — Удзела — Мосар — гара Маяк — Слабодка — Браслаў — Опса — Відзы — Мядзел — Менск.** Тэл.: 232-54-58, 8-029-622-57-20 (Зьміцер); 264-12-38, 8-029-776-24-35 (Павал).

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ____________________

____________________

**Імя і прозьвішча** ____________________

**Адрас, тэлефон** ____________________

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фота-рэдактар | Арцём Лява |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3526. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 7.04.2004.
Замова № 2093.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а